

Дзякуючы Валянціну СТАНКЕВІЧУ кнігу Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому», творы Івана Мележа і іншых беларускіх аўтараў цяпер можна пачуць у DAISY-фармаце аўдыякніг для людзей з праблемамі зроку. СТАР. 3



Сёлета спаўняецца 70 гадоў з пачатку адной з буйнейшых гітлераўскіх аперацый «Зімовае чараўніцтва», якую фашысты ўчынілі на тэрыторыі цяперашняга Верхнядзвінскага раёна. СТАР. 5



У Магілёўскім мастацкім музеі імя Паўла Масленікава адкрылася выстава «Старажытнае мастацтва». Самы каштоўны экспанат — выратаваная фрэска з царквы ў гонар Нараджэння Багародзіцы ў Слаўгарадзе. СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родnай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛЮТАГА 2013 г. АЎТОРАК № 27 (27392) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАЧАЎСЯ РАБОЧЫ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ Ў РАСІЙСКУЮ ФЕДЭРАЦЫЮ

**Рабочы візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Расійскую Федэрацыю пачаўся 11 лютага. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У ходзе тэлефоннай размовы, якая адбылася напярэдадні, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Сочы і азнаёміцца з ходам падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў 2014 года.

Плануецца, што кіраўнік беларускай дзяржавы агледзіць спартыўныя і іншыя аб'екты інфраструктуры, наведае міжнародныя спаборніцтвы, правядзе шэраг рабочых сустрэч. Там жа Прэзідэнт Беларусі правядзе кароткачасовы водпуск.

## ЖЛОБІН — СТАЛІЦА «ДАЖЫНАК-2013»

**Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2013» пройдзе ў другой палове верасня ў Жлобіне і Жлобінскім раёне Гомельскай вобласці. Адпаведнае распараджэнне Прэзідэнт Беларусі падпісаў 8 лютага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Для падрыхтоўкі і правядзення фестывалю-кірмашу створаны арганізацыйны камітэт пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Русага.

Традыцыйна на свяце будуць ушаноўваць пераможцаў рэспубліканскіх спаборніцтваў за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы травяных кармоў, у вырошчванні льну і вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі, а таксама рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў у сельскай гаспадарцы.

## УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка правёў учора перагаворы з прэм'ер-міністрам Каралеўства Камбоджа Хун Сенам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.**

Прэм'ер-міністр Камбоджы адзначыў, што яму імпануе падыход і ўвага беларускага парламента да развіцця ўзаемадзеяння дзвюх краін не толькі ў заканадаўчай сферы, але і па іншых важнейшых пытаннях міждзяржаўнага супрацоўніцтва.

«Старшыня Палаты прадстаўнікоў пацвердзіў цікавасць беларускага боку да арганізацыі візіту ў Беларусь прэм'ер-міністра Камбоджы», — адзначылі ў прэс-службе.

## «ТРЫНЦЫ-БРЫНЦЫ, ПЯЧЫЦЕ БЛІНЦЫ!..»



Фота БЕЛТА.

*10 лютага аграгарадок Індура Гродзенскага раёна па старадаўніх абрадах і з блінамі развітаўся з зімой. На мясцовым стадыёне прайшлі гулянні, на якіх спявалі прыпеўкі, спальвалі пудзіла, каталіся на санях.*

## ЛІЧБА ДНЯ

**9 млн 463,3 тыс.**

***чалавек склала колькасць насельніцтва краіны на 1 студзеня гэтага года (мэта нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі — стабілізаваць колькасць насельніцтва да 2015 года на ўзроўні 9,44-9,45 млн чалавек). У 2012 годзе агульны каэфіцыент нараджальнасці дасягнуў 12,2 на 1000 чалавек насельніцтва (у 2011 годзе — 11,5 праміле). Натуральнае змяншэнне насельніцтва склала 11 тыс. 147 чалавек (супраць 25 тыс. 735 чалавек у 2011 годзе). Актыўныя меры падтрымкі сям'і спрыялі павелічэнню колькасці нованароджаных: у 2012 годзе нарадзіліся 115 тыс. дзяцей, што на 5,6 тыс. (на 5,2%) больш, чым у 2011-м.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.02.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 | ▼ |
| Еўра | 11540,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1064,12 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | 0° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 2° |
| Гродна | 0° |
| Магілёў | 0° |
| Мінск | 0° |

## Напрыканцы тыдня падмарозіць да мінус 15

У аўторак наша краіна трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, што рухаюцца да нас з боку Украіны, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА. Удзень пераважна па паўночным усходзе Беларусі пройдзе снег і мокры снег. Дарогі слізкія. Тэмпература паветра — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

У сераду і чацвер атмасферны ціск будзе расці і ападкаў стане менш. Толькі месцамі чакаецца кароткачасовы снег. У асобных раёнах — туман і намаразь. На дарогах — галалёдзіца. Пахаладае. Тэмпература ўначы ад 0 да мінус 7, пры праясненнях да 8—13 марозу. Удзень — ад мінус 4 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Сустрэча без абцасаў

## «АПТЫМІЗМ НАЙЛЕПШ СПРЫЯЕ ВА ЎСІХ СПРАВАХ»

**Напрыканцы мінулага года Святлана Міхайлаўна ГЕРАСІМОВІЧ, якая на працягу двух скліканняў была старшынёй Мінскага абласнога савета дэпутатаў, узначаліла Пастаянную камісію Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Як толькі асвоілася на новым месцы, згадзілася на душэўную размову. Пры гэтым зазначыла, што менавіта душэўнасць дапамагала і дапамагае ёй знаходзіць падыход да людзей, якія прыходзяць на прыёмы не толькі для таго, каб вырашыць нейкую праблему, але і каб параіцца ці проста выгаварыцца.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### Пра маці, французскую мову і інтэрнэт

**Усё найлепшае, што ўва мне ёсць,** закладзена ў дзяцінстве мамай і школай, у якой я вучылася. У той час нам прывівалі шчырасць, адказнасць, калектывізм, вучылі дапамагаць блізкім.

**Мама была для мяне** не толькі мамай, але і па душы самым блізкім чалавекам. Надзея Макараўна Снатовіч, выдатнік народнай адукацыі, усё жыццё прысвяціла школе. Я нават часам раўнавала маму да яе вучняў, бо мне здавалася, што яна іх любіць не менш, чым мяне. Пра кожнага клапацілася, за кожнага перажывала.

**У нас дома** была цудоўная бібліятэка. Таму на першым плане заўсёды стаялі кнігі. Я і цяпер люблю чытаць. Падабаюцца Талстой, Пастарнак, Ахматава, Цвятаева, Караткевіч. Часам цікава «пакапацца» ў Дастаеўскім. Зачытваюся гістарычнымі раманамі. Каб зусім не забыцца французскую мову, час ад часу перачытваю навелы Андрэ Маруа. Не ігнарую і сучасную літаратуру — у прыватнасці, прозу Міколы Мятліцкага, паэзію Раісы Баравіковай. Часу за працай мала застаецца, але прачытаць хоць некалькі старонак перад сном — гэта святое.

**Усё новае добра ўспрымаю.** Я ў гэтым плане чалавек мабільны. Карыстаюся камп'ютарам, інтэрнэтам. Гэта вельмі зручна. Глабальная сетка дазваляе значна пашырыць кругагляд, дае магчымасць чытаць кнігі, не купляючы іх, глядзець фільмы і слухаць музыку, якую цяжка знайсці на дысках, адшукваць патрэбныя артыкулы, аператыўна даведацца абсалютна пра ўсё, што адбываецца ў любой кропцы свету. Часу на пошук інфармацыі затрачваецца нашмат менш, а аб'ём атрыманых звестак не можа не радаваць.

**У маёй кватэры заўсёды ёсць жывыя кветкі.** Вельмі люблю ружы і званочкі, але восенню гэта можа быць і букет з кляновых лістоў. Зімой сасновая галінка з шышкамі ў вазе добра глядзіцца. Асаблівае стаўленне да кветак выхавана маёй мамай. Яна зразала з клумбы альбо збірала на лузе рамонкі, валошкі, хрызантэмы, вяргіні, півоні, прыносіла іх і ставіла ў вазу на стол.

**Некалі з мамай** па вечарах спявалі — гэта была своеасаблівая аддушына. Цяпер адпачываю душой, калі слухаю, як сын іграе на піяніна. У боўлінг разам з ім ходзім гуляць. Адно з нашых хобі — наведваць мастацкую галерэю. У нас з сынам з-за розніцы ва ўзросце не супадаюць некаторыя погляды, у тым ліку і на мастацтва. Таму мне заўсёды цікава пачуць, што ён думае пра тую ці іншую карціну. Люблю рускі драматычны тэатр, тэатр оперы і балета. З задавальненнем узгадваю спектаклі «Пане Каханку» А. Курэйчыка, «Сымон-музыка» Я. Коласа, італьянскія оперы «Тоска» Д. Пучыні, «Аіда» Д. Вердзі. СТАР. 3

## САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА Ў 2013 ГОДЗЕ: НОВАЎВЯДЗЕННІ НЕПАЗБЕЖНЫЯ

**Днямі прайшла калегія Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, на якой былі агучаны асноўныя кірункі працоўнай і сацыяльнай палітыкі на наступны год. Размова, у прыватнасці, ішла...**

### ...аб зарплаце

— Варта перайсці ад цэнтралізаванага рэгулявання (зарплаты. — **Аўт**.) да спалучэння цэнтралізаванага і галіновага рэгулявання, захаваўшы пры гэтым цэнтралізаванае рэгуляванне тарыфнай часткі, а якасць працы кожнага работніка ацэньваць праз стымуляванне надтарыфнай часткай. І гэта права даць кіраўнікам, — сказала на калегіі **міністр працы і сацабароны Марыяна ШЧОТКІНА.** — Адначасова будзе прадоўжана работа па адмене карэктуючых каэфіцыентаў. У 2013 годзе таксама неабходна завяршыць работу па фарміраванні новага механізму аплаты працы дзяржаўных служачых.

### ...аб сацпадтрымцы

Працаздольныя людзі, якія ўхіляюцца ад пастаяннай працоўнай дзейнасці, не змогуць атрымліваць сацыяльныя выплаты. У прыватнасці, Мінпрацы і сацабароны прапануе ўключыць у паўнамоцтвы камісій па прызначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) новыя функцыі — распрацоўку індывідуальных планаў па паляпшэнні становішча працаздольных грамадзян, якія атрымліваюць сацыяльную дапамогу, а таксама рэкамендацый для іх па самастойным выхадзе з цяжкай жыццёвай сітуацыі. Акрамя таго, такая камісія атрымае паўнамоцтвы адмаўляць у прадастаўленні дапамогі тым, хто не выканаў гэтыя рэкамендацыі і паўторна звярнуўся па дапамогу.

«Пры гэтым камісіі на месцах павінны працаваць празрыста, сумленна і аказваць дапамогу тым, хто мае патрэбу, — лічыць Марыяна Шчоткіна. — Такі падыход дасць магчымасць узмацніць адраснасць сацыяльнай дапамогі і больш рацыянальна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі».

### ...аб дапамозе па доглядзе інвалідаў I групы і асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту

Адной з мер сацыяльнай падтрымкі з'яўляецца дапамога па доглядзе інвалідаў I групы і асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту. З 1 студзеня 2012 года яе памеры павялічыліся і склалі 100% і 120% бюджэту пражытковага мінімуму, адпаведна, пры доглядзе адной або дзвюх і больш асоб. Як сказала міністр, пасля павелічэння дапамогі да яе сталі праяўляць вялікую цікавасць грамадзяне, якія настроены на ўтрыманства. Так, па стане на 31 снежня 2012 года, колькасць такіх дапамог склала 50 389, што на 23% больш, чым у 2011 годзе. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КІТАЙ УПЕРШЫНЮ Ў ГІСТОРЫІ АБЫШОЎ ЗША ПА ГАНДЛЁВЫМ АБАРОЦЕ



Кітай выйшаў у лідары сусветнага гандлю па выніках 2012 года. КНР змагла абагнаць ЗША, якія ўтрымлівалі гэтае званне практычна з канца Другой сусветнай вайны, паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на інфармацыю амерыканскага міністэрства гандлю і мытнага ўпраўлення КНР. Аналітыкі агенцтва параўналі суму экспарту і імпарту абедзвюх краін: для ЗША гэты паказчык у мінулым годзе быў роўны 3,82 трлн долараў (прыкладна чвэрць ВУП, па даных 2011 года), для Кітая — 3,87 трлн долараў (больш за палову ВУП). Шэраг экспертаў, уключаючы аналітыкаў HSBC Holdings Plc, лічыў, што Кітай абыдзе ЗША не раней за 2016 год.

Як падкрэслівае Bloomberg, выхад КНР на першае месца ў свеце па сукупным аб'ёме знешняга гандлю таварамі — важны эпізод у эканамічным саперніцтве дзвюх краін. Найбуйнейшым экспарцёрам свету Кітай стаў яшчэ ў 2009 годзе, аднак ЗША да гэтага часу ўтрымліваюць званне вядучага сусветнага імпарцёра.

### У РЫЗЕ САРВАНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ ПА БЯСПЛАТНЫМ ПРАЕЗДЗЕ Ў АЎТОБУСАХ

У Рызе прыпынена дзеянне ініцыятывы, згодна з якой аўтаўладальнікі маглі бясплатна карыстацца грамадскім транспартам падчас снегападу. Адпаведнае рашэнне, як піша DELFI, прыняў міністр навакольнага асяроддзя і рэгіянальнага развіцця Латвіі Эдмунд Спруджс.

По словах чыноўніка, аўтары новаўвядзення — прадстаўнікі Рыжскай думы — не змаглі пераканаць ведамства ў тым, што падобная практыка законная. Эксперымент, у рамках якога рыжскія аўтааматары маглі бясплатна ездзіць у аўтобусах, стартаваў 13 снежня 2012 года. Гарадскія ўлады, грунтуючыся на прагнозах надвор'я, загадзя называлі дні, калі машыну варта пакінуць дома. Адпаведная інфармацыя распаўсюджвалася з дапамогай СМІ. Каб скарыстацца правам бясплатнага праезду падчас снегападу, аўтаўладальнікам трэба было прад'явіць тэхпашпарт. Мэр Рыгі Ніл Ушакоў адзначыў, што Рыжская дума абскарджвае рашэнне міністэрства ў судзе.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАПА БЕНЕДЫКТ XVI ПАКІДАЕ РЫМСКІ ПРАСТОЛ



Папа Рымскі Бенедыкт XVI збіраецца пакінуць трон рымскага першасвятара, упершыню за 600 гадоў добраахвотна адмовіўшыся ад прастола. Аб гэтым пантыфік паведаміў асабіста на лацінскай мове падчас пасяджэння ардынарнай Кансісторыі па пытанні кананізацыі Аранцкіх пакутнікаў. Заява аб адстаўцы павінна быць зроблена вечарам 28 лютага. Канклаў па абранні новага Папы збярэцца ў сакавіку 2013 года, перадае ANSA.

Па словах пантыфіка, у сучасным свеце для здзяйснення місіі Святога Пятра і пропаведзі Евангелля патрабуюцца вялікія духоўныя і цялесныя сілы. За апошнія ж некалькі месяцаў стан яго здароўя пагоршыўся да такой ступені, што ён вымушаны быў прызнаць сваю няздольнасць «адэкватна выконваць» ускладзеную на яго місію.

«Усведамляючы ўсю сур'ёзнасць гэтага кроку і будучы цалкам вольны, заяўляю, што адмаўляюся ад служэння на троне Рымскага біскупа, пераемніка святога Пятра, ускладзенага на мяне кардыналамі 19 красавіка 2005 года. Такім чынам, з 20 гадзін 28 лютага 2013 года Рымскі трон святога Пятра будзе пуставаць. Тымі, у чыёй кампетэнцыі знаходзяцца падобныя пытанні, павінен быць скліканы канклаў для абрання новага Вярхоўнага пантыфіка», — заявіў далей Бенедыкт XVI.

Заява Папы заспела знянацку нават яго найбліжэйшае асяроддзе, перадае Reuters. Словы Бенедыкта XVI аб сыходзе сталі «громам сярод яснага неба», прызнаў дзяржаўны сакратар, кіраўнік урада Святога Прастола, кардынал Тарчызіа Бэртонэ.

16 красавіка гэтага года пантыфіку споўніцца 86 гадоў.

КОРАТКА

Вядомы падарожнік Фёдар Конюхаў, які мае сан праваслаўнага свяшчэнніка, установіць на Паўночным полюсе крыж, зроблены ў Беларусі. Крыж выраблены айцом Уладзімірам Герасіменкам, які раней займаўся разьбой па дрэве. Вышыня крыжа — 2,4 м, вага — 15 кг.

Фізічныя асобы ў студзені 2013 года прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $622,7 млн у эквіваленце, набылі — $700,8 млн. Суб'екты валютных аперацый — рэзідэнты Беларусі за мінулы месяц рэалізавалі замежнай валюты на $1 668,7 млн, купілі — на $1 851,8 млн. Нерэзідэнты Беларусі (банкі і суб'екты гаспадарання) у студзені прадалі $140,5 млн, набылі $206,7 млн.

У Мінску пакуль не гатовы падключыць прыватныя клінікі да выдачы бальнічных лістоў грамадзянам. Пытанне — у кантролі бальнічных.

Мінскі абласны суд асудзіў учора былога першага намесніка старшыні Мінгарвыканкама Ігара Васільева да 14 гадоў пазбаўлення волі.

Для юрыдычных асоб Беларусі будуць павялічаны ў два разы тарыфы на электрычную энергію і цэны на прыродны газ, спажытыя звыш аб'ёмаў, устаноўленых заданнямі ўрада.

## ЯК ВЫ ПРАВОДЗІЛІ ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ?



**Дзмітрый МУХА, супрацоўнік Інстытута біяарганічнай хіміі НАН РБ:**

— Апошнія зімовыя канікулы былі даўно. Абавязковы пункт — гэта падрыхтавацца да зімовых свят і весела іх правесці. Канікулы — гэта шанц з'ездзіць у турыстычную паездку, хоць атрымлівалася не заўсёды. А яшчэ гэта магчымасць сустрэцца з сябрамі і сваякамі, калі яны жывуць далёка. А добры студэнт біяфака абавязкова павінен быў прысвяціць большую частку канікулаў навукова-даследчай працы ў лабараторыі (*смяецца*).



**Андрэй МАКАРАЎ, журналіст газеты «Прессбол»:**

— Узімку мая ўвага галоўным чынам была прыкавана да трох падзей: чэмпіянату свету па гандболе, плэй-офу па амерыканскім футболе і фіналу па «Супербоўле-47». На астатняе, нават на баталіі накшталт «Барселона» — «Рэал» ці «Барусія» — «Баер», не кажучы ўжо пра ўвагу да беларускага спартыўнага жыцця, часу сапраўды не заставалася. Ды і дзе яго ўзяць, калі вячэрні гандбол змяняўся начнымі праглядамі лепшай амерыканскай гульні? Аднак я рады, што ўдалося размеркаваць графік адсочвання матчаў такім чынам, каб не пацярпела цікавасць да іншых рэчаў. У прыватнасці, да кіно. «Джанга вызвалены» і «Лінкальн», прызнаюся, лепшае, што даводзілася бачыць за апошні час. Таранціна і Спілберг папрацавалі на славу. Дай Бог ім здароўя.



**Ульяна Лойка, студэнтка II курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта:**

— Зімовыя канікулы я праводжу дома, у Брэсце. Люблю менавіта гэтыя вакацыі за тое, што яны спакойныя і даволі кароткія. З'яўляецца час, каб пачытаць тыя кнігі, якія даўно збіралася, але не атрымлівалася з-за вучобы. А яшчэ ўзімку мы з бацькамі абавязкова ездзім пакатацца на лыжах. Сёлета пабывала ў Букавелі. Галоўнае, пра што нельга забыцца на зімніх канікулах — дзень сустрэчы выпускнікоў у школе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

## ІНТЭЛЕКТ І НЕПЕРАЎЗЫДЗЕНЫ ТАЛЕНТ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў намесніка па навуковай рабоце ў галіне аўтамабільнай і кар'ернай тэхнікі — генеральнага канструктара па аўтамабільнай тэхніцы Беларусі Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі Міхаіла Высоцкага з 85-годдзем, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«З Вашым імем непарыўна звязаны выдатныя навуковыя дасягненні ў галіне машынабудавання, якія атрымалі прызнанне ў Беларусі і за яе межамі. Створаныя пад Вашым кіраўніцтвам унікальныя інжынерныя распрацоўкі сталі асновай для фарміравання ў рэспубліцы сучаснай вытворчасці аўтамабільнай тэхнікі», — адзначаецца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Міхаілу Высоцкаму здароўя, невычэрпнай энергіі, шчасця і дабрабыту. «Няхай і ў далейшым Ваш інтэлект, непераўзыдзены талент і высокі прафесіяналізм садзейнічаюць умацаванню і працвітанню беларускай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА Ў 2013 ГОДЗЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ...аб кошце сацыяльных паслуг

На калегіі міністр выказалася за перагляд і большую дыферэнцыяванасць кошту сацыяльных паслуг.

Кошт сацыяльных паслуг рэгулюецца рашэннямі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. На 1 студзеня гэтага года для паслуг, якія ўваходзяць у пералік бясплатных і агульнадаступных, ён вагаўся ад 1500 да 2950 рублёў па розных абласцях. Як лічыць міністр, сацыяльныя паслугі павінны заставацца даступнымі, і ў той жа час павінны прадастаўляцца па разумных тарыфах. Перагледжаны падыходы да прадастаўлення сацыяльных паслуг на даму і ў аддзяленнях кругласутачнага знаходжання пажылых грамадзян і інвалідаў, якія маюць працаздольных дзяцей. Сацыяльныя паслугі на даму будуць прадастаўляцца бясплатна толькі адзінокім малазабяспечаным грамадзянам. Калі непрацаздольныя старыя маюць працаздольных дзяцей, яны будуць абслугоўвацца на ўмовах поўнай аплаты.

Адзінокія старыя і інваліды таксама змогуць знаходзіцца ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання грамадзян на ўмовах частковай аплаты. Але калі яны маюць працаздольных дзяцей, то будуць аплачваць паслугі аддзялення кругласутачнага знаходжання цалкам. Гэтыя меры накіраваны на прыцягненне дзяцей да вырашэння праблем сваіх пажылых бацькоў.

### ...аб пенсійнай сістэме

Асноўнай задачай пенсійнага забеспячэння ў мінулым годзе было паступовае павелічэнне пакупніцкай здольнасці пенсій. Пры гэтым у першую чаргу падтрымліваліся атрымальнікі пенсіі старэйшых узростаў. Так, у 2012 годзе па рашэнні Прэзідэнта краіны да пенсій людзей ва ўзросце 75 гадоў і больш сталых была ўстаноўлена мэтавая даплата. Таксама Указам кіраўніка дзяржавы № 136 людзям было прадастаўлена права выбару: выйсці на пенсію або пры дасягненні пенсійнага ўзросту, або пазней, зарабіўшы пры гэтым больш высокую пенсію.

Летась штоквартальна праводзіліся пераразлікі пенсій. У выніку сярэднямесячная пенсія па ўзросце вырасла амаль у 2 разы і складае зараз каля 2 млн рублёў. Суадносіны пенсіі да сярэдняга заробку работнікаў знаходзяцца на ўзроўні 40%, што адпавядае рэкамендацыям Міжнароднай арганізацыі працы.

Як было сказана на калегіі, у гэтым годзе пенсіі будуць пераразлічвацца з улікам росту заработнай платы работнікаў, змены кошту жыцця і магчымасцяў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Разам з тым, міністр працы і сацыяльнай абароны лічыць, што ва ўмовах старэння насельніцтва пенсійная сістэма павінна рацыянальна расходаваць наяўныя пенсійныя сродкі. У прыватнасці, на думку міністра, яна павінна ўключаць у сябе тры кампаненты: дзяржаўную, карпаратыўную, добраахвотна-назапашвальную пенсіі. У краіне павінны развівацца схемы добраахвотнага карпаратыўнага пенсійнага страхавання. Сёння, па словах Марыяны Шчоткінай, такія схемы ўжо дзейнічаюць у акцыянерных таварыствах «БМЗ», ЗАТ «Атлант», «БелАЗ», унітарным прадпрыемстве «Гомсельмаш». Прапрацоўваюцца пытанні паступовага пераходу да вылічэння пенсій па даных персаніфікаванага ўліку.

Важным дасягненнем Мінпрацы і сацабароны Беларусі з'явілася рашэнне праблемы фарміравання і рэалізацыі ў Расіі пенсійных правоў тых беларусаў, якія працавалі ў Расіі, маючы статус асоб, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі краіны. Праца над урэгуляваннем гэтай праблемы вялася беларускім бокам больш за чатыры гады.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Тэма дня

# «РАЗУМНЫ» ДОМ: І ЭКАНОМІЯ, І КАМФОРТ

### З 1 ліпеня будзе праектавацца толькі энергаэфектыўнае жыллё

**Ужо сёлета, з другога паўгоддзя праектаванне энергаэфектыўных жылых дамоў будзе не эксперыментам, а абавязковай нормай. А з наступнага года краіна павінна цалкам перайсці на будаўніцтва жылля ў энергаэфектыўным фармаце. Аб гэтым было абвешчана ў Гродне на семінары-нарадзе па пытаннях жыллёвага будаўніцтва з удзелам прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча.**



Фота БЕЛТА.

Міхаіл Мясніковіч прысутнічаў на прэм'еры спектакля «Пікавая дама», якая адбылася ў адноўленым пасля рэканструкцыі Гродзенскім абласным тэатры лялек.

### За ацяпленне — 9 тысяч рублёў

Такую, можна сказаць, сімвалічную суму заплаціў за ацяпленне сваёй трохпакаёвай кватэры ў снежні адзін з жыхароў другой у рэспубліцы і пакуль адзінай у Гродне энергаэфектыўнай шматпавярхоўкі па вуліцы Дзяржынскага, 23 б. І яшчэ каля 20 тысяч рублёў — за месцы агульнага карыстання. Увогуле плата за камунальныя паслугі аказалася прыкладна ў чатыры разы меншай у параўнанні з іншымі дамамі з электраплітамі ў абласным цэнтры. Аб гэтым паведаміў удзельнікам рэспубліканскага семінара адзін з ініцыятараў будаўніцтва гэтага дома Уладзімір Дзяшко, які раней узначальваў інстытут «Гроднаграмадзянпраект», а цяпер працуе намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

> **Дзякуючы аптымальнаму тэмпературна-вільготнаснаму рэжыму ў кватэрах ствараюцца камфортныя ўмовы, няма сырасці і цвілі, якія сёння з'яўляюцца бядой многіх жылых будынкаў і параджаюць шматлікія скаргі.**

Адкуль жа ўзяліся ў жыроўках сумы, неверагодныя для пераважнай колькасці жылых будынкаў? Уладзімір Дзяшко прапануе параўнанне з іншымі дамамі, што размешчаны на гэтай пляцоўцы. Вось дом пабудовы 1950-х гадоў: цеплаcпажыванне складае 220 кВт/гадзін на 1 кв. м у год. Побач, у так званай «хрушчоўцы», — 190 кВт/г, а ў суседняй «брэжнеўцы» — 170 кВт/г на 1 кв.м. А цяпер адчуйце розніцу: спажыванне цяпла ў энергаэфектыўным доме — 35 кВт/г на 1 кв.м у год.

Гэты дом (інстытут «Гроднаграмадзянпраект» выступаў заказчыкам і праекціроўшчыкам у адной асобе) здалі ў эксплуатацыю ў верасні 2009 года. За гэты час і жыльцы, і спецыялісты маглі пераканацца, што сістэма прыточна-выцяжной механічнай вентыляцыі з рэкуперацыяй, што ўстаноўлена ў кожнай кватэры «разумнага» дома, працуе бездакорна, тым самым у разы скарачаючы затраты на ацяпленне. Гэта даказана і сумамі па аплаце за энергарэсурсы ў жыроўках. Пры гэтым, бадай, самае галоўнае вось у чым: дзякуючы аптымальнаму тэмпературна-вільготнаснаму рэжыму ў кватэрах ствараюцца камфортныя ўмовы, няма сырасці і цвілі, якія сёння з'яўляюцца бядой многіх жылых будынкаў і параджаюць шматлікія скаргі.

### Нічога «завоблачнага»

— Сёлета з другога паўгоддзя ўсе дамы ў краіне павінны праектавацца па энергаэфектыўных тэхналогіях, каб не было будынкаў з вялікімі стратамі цяпла. Тым самым можна сэканоміць вялізныя сродкі. Ужо не будзе такой вялікай неабходнасці ў будаўніцтве новых цеплакрыніц, што працуюць на прыродным газе, які купляецца за валюту. Так, кошт квадратнага метра ў энергаэфектыўным доме павялічваецца. Аптымісты кажуць, што на 6-7%. На мой — «песімістычны» — погляд — не больш чым на 10%. Але, маючы такое павялічэнне аднаразовых затрат на будаўніцтва, мы потым у 3-4 разы эканомім на затратах энергарэсурсаў і аплаце за цеплазабеспячэнне кватэр, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Не ўсё тут проста, паколькі «разумныя» сістэмы цеплазабеспячэння энергаэфектыўных дамоў, многія прыборы, якія забяспечваюць стварэнне адпаведных тэмпературна-вільготнасных паказчыкаў у кватэрах, мы пакуль вымушаны закупляць па імпарце. Але я ўпэўнены, што гэтыя пытанні будуць вырашацца — нічога «завоблачнага» ў гэтых прыборах няма, і ў нас даволі моцная прамысловасць, адпаведныя канструктарскія падраздзяленні, каб на працягу 1-2 гадоў асвоіць іх вытворчасць у сябе.

Дарэчы, вышэйзгаданы паказчык цеплаcпажывання энергаэфектыўнага дома ў Гродне — ужо зусім не рэкорд. Напрыклад, у Германіі гэты паказчык не павінен перавышаць 20 кВт/г на 1 кв.м, а ў Аўстрыі забаронена будаваць муніцыпальнае жыллё, дзе цеплаcпажыванне складае больш за 15 кВт/г на 1 м. Можа, неўзабаве на падобны ўзровень атрымаецца выйсці і нам: у рамках міжнароднага праекта ўжо сёлета можа распачацца будаўніцтва двух энергаэфектыўных дамоў у Мінску і аднаго ў Гродне. Ставіцца задача, каб цеплаcпажыванне ў іх не перавышала 20 кВт/г на 1 кв.м у год. На думку Уладзіміра Дзяшко, гэта рэальна.

### Індывідуальны дом: на якіх умовах?

Энергаэфектыўныя праектныя рашэнні павінны быць і пры індывідуальным жыллёвым будаўніцтве, аб'ёмы якога ў краіне значна павялічацца, лічыць Міхаіл Мясніковіч. Гэта закладзена ў праекце канцэпцыі жыллёвай палітыкі, якая накіравана на разгляд Прэзідэнта Беларусі.

Удзельнікі семінара азнаёміліся з практыкай будаўніцтва індывідуальных дамоў прадпрыемствам «Гроднажылбуд» (увогуле ў краіне сёння каля 60 тысяч ахвотных пабудаваць індывідуальнае жыллё) і абмеркавалі шляхі вырашэння праблем, якія пры гэтым узнікаюць. Адна з галоўных: у які тэрмін асвойваюцца выдзеленыя зямельныя ўчасткі? Тут у забудоўшчыкаў узнікае шмат цяжкасцяў. Хтосьці на гэтай пляцоўцы ўжо пабудаваўся, а хтосьці толькі пачынае, узнікаюць праблемы з інфраструктурай — забеспячэннем вадой, электраэнергіяй, з газіфікацыяй, пад'язнымі дарогамі. Як паскорыць гэты працэс, пры гэтым улічыўшы інтарэсы і тых забудоўшчыкаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай, і тых, хто льготамі не карыстаецца?

— Калі на адной тэрыторыі адначасова вядзецца будаўніцтва і на ўмовах камерцыйнага фінансавання, і з дзяржаўнай падтрымкай, не павінна быць ператоку сродкаў альбо, барані Божа, злоўжыванняў, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Таму цяпер адпрацоўваюцца найбольш прымальныя схемы індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Мяркуецца, што ўпраўленні капітальнага будаўніцтва альбо іншыя ўпаўнаважаныя выканкамамі арганізацыі будуць ажыццяўляць падрыхтоўку ўсёй праектна-каштарыснай дакументацыі на той ці іншы раён індывідуальнай забудовы, уключаючы дакументы на зямлю, іх рэгістрацыю і будаўніцтва дамоў з іх наступнай перадачай усім катэгорыям забудоўшчыкаў. Прычым гэта будзе комплексная забудова з поўным інфраструктурным забеспячэннем (вада, электрычнасць, цеплазабеспячэнне, каналізацыя, дарогі). Для тых, хто мае права на дзяржаўную падтрымку (напрыклад, шматдзетныя сем'і), зямельны ўчастак прадастаўляецца бясплатна ў пажыццёвае ўладанне і карыстанне. Тым жа, хто права на льготы не мае, гэтыя дамы будуць прадавацца разам з зямельнымі ўчасткамі на ўмовах конкурсу.

На думку Міхаіла Мясніковіча, такая схема дазволіць комплексна і даволі хутка асвойваць раёны індывідуальнай забудовы, не зацягваючы пры гэтым з вырашэннем пытання інжынернай інфраструктуры.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАЛЕССЕ АДЧУВАЕ НАСТУПСТВЫ ЛЮТАЎСКАЙ АДЛІГІ

У Петрыкаве жылыя падворкі, якія знаходзяцца ў нізінных месцах, падтоплены адталай вадой. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, адразу некалькі жыхароў райцэнтра з розных вуліц звярнуліся да выратавальнікаў з просьбай адпампаваць ваду. На аказанне дапамогі людзям была накіравана спецыяльная тэхніка. Дарэчы, у зоне падтаплення знаходзяцца чатыры дамы, у якіх пражывае сем чалавек. Эвакуацыя жыхароў з падтопленых домаўладальніцтваў не патрабуецца. Прычынай лютаўскай вялікай вады стала працяглая адліга, а таксама вялікая колькасць ападкаў. Цяпер у Петрыкаве ажыццяўляецца маніторынг становішча, праводзіцца абследаванне дваровых тэрыторый.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НОВЫЯ КАСЦЮМЫ... ДЛЯ «НАЗЕМНЫХ КАСМАНАЎТАЎ»

**Віцебскія навукоўцы з навукова-даследчага цэнтра абласнога ўпраўлення МНС распрацоўваюць тканіны, у адзенні з якіх пажарныя змогуць вытрымліваць высокія тэмпературы — да 500 градусаў па Цэльсію.**

Як расказаў **Васіль ЧАКАН, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС,** пасля іх укаранення ў вытворчасць пажарныя змогуць больш камфортна адчуваць сябе падчас тушэння пажараў з высокай тэмпературай, калі трэба максімальна наблізіцца да агню. Маюцца на ўвазе пажары цыстэрнаў з гаручым, рэзервуараў або буйных сховішчаў нафтапрадуктаў. Раней гэтыя ж вучоныя распрацавалі тканіны для тушэння агню тэмпературай да 200 градусаў. Іх праца дазволіла сэканоміць шмат валюты на набыцці аналагічных замежных «аксесуараў» для абароны пажарных. Паралельна навуковыя знаходкі дазваляюць экспартаваць гатовыя вырабы беларускай вытворчасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У ПІНСКУ БУДЗЕ ФУТБОЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ

**Будаўніцтва Пінскай футбольнай акадэміі распачата ў мікрараёне «Вясёлкавы» старажытнага горада.**

Мяркуецца, што ў акадэміі будуць займацца юныя найбольш перспектыўныя футбалісты з усёй Беларусі. На першым этапе стварэння футбольнай «ВНУ» прадугледжана будаўніцтва футбольных палёў — двух трэніровачных і гульнявога з трыбунамі для гледачоў. Затым будзе ўзведзены футбольны манеж, а пасля — гасцініца. Архітэктурны праект, падрыхтаваны мінскімі спецыялістамі, прайшоў дзяржаўную экспертызу. Вызначаны і будаўнікі — Будтрэст № 8. Інвестарам гэтага маштабнага праекта стала расійская кампанія «АЛМІ», якой кіруе ўраджэнец Пінска Аляксандр Зарыбка. Паспяховы бізнэсмен у дзяцінстве сам займаўся спортам. У апошнія гады ён актыўна падтрымліваў матэрыяльна дзіцяча-юнацкую спартыўную школу № 3 роднага горада.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СТРАЛЯЎ З ПНЕЎМАТЫКІ НА ПРЫПЫНКУ

**Калі на прыпынку грамадскага транспарту па вуліцы Захарава з'явіўся 35-гадовы мужчына, ён адразу прыцягнуў да сябе ўвагу сваімі неадэкватнымі паводзінамі. Напачатку пачаў лаяцца ў адрас незнаёмага маладога чалавека, а калі той зрабіў заўвагу, дастаў з кішэні... пісталет.**

— Калі хлопец падаўся назад, мужчына стрэліў у яго бок. А затым пачаў пагражаць дзяўчыне, што стаяла непадалёку. Міліцыю выклікалі людзі, якія сталі сведкамі здарэння, — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Праваахоўнікі затрымалі хулігана. Зламыснікам аказаўся індывідуальны прадпрымальнік, раней судзімы за махлярства і нявыплату аліментаў. Акрамя таго, у «паслужным спісе» грамадзяніна аказаліся і 24 адміністрацыйныя правапарушэнні. Па факце здарэння заведзена крымінальная справа, праводзіцца расследаванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка ўпраўлення вытворча-тэхнічнага развіцця Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Дарошка Вользе Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Блізкая ўлада

# У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКОНАМ

### На прыёме ў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка часам было горача...

### Транспарт для вялікай сям'і



Жыхарка Шклова Аксана Андрэева, выхавальніца дзіцячага дома сямейнага тыпу, звярнулася да кіраўніка вобласці з надзеяй на вырашэнне транспартнай праблемы. У гэтым доме сёння жыве 9 дзяцей, сярод якіх — немаўля і малое з абмежаванымі здольнасцямі. Сям'я выбрала для жыцця прасторны і ўтульны дом, які месціцца не вельмі блізка ад аўтамагістралі. Да прыпынку грамадскага транспарту трэба ісці каля кіламетра.

Пакуль у сям'і быў свой аўтамабіль, гэта здавалася нават перавагай: свежае, без выхлапаў паветра і бяспечныя дзіцячыя гульні на вуліцы. Аднак Аксана Андрэева расказала, што аўтамабіль, набыты ў крэдыт, згарэў, але, паводле страхавога дагавора, гэты выпадак не прадугледжваў кампенсацыі. Таму цяпер жыццё шматдзетнай сям'і псуе транспартная праблема: паездкі ў школу, паліклініку і нават у краму патрабуюць высілкаў і часу. А новы аўтамабільны крэдыт не пацягнуць: «Застануся без кавалка хлеба», — шчыра сказала маці.

Пётр Руднік заўважыў, што, хоць па законе ўлады не прадастаўляюць транспарт для дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, але відавочна, што сям'і трэба дапамагчы. На жаль, прадоўжыць маршрут аўтобусаў да дзіцячага дома нельга з-за вузкай дарогі. На пэўны час з падвозам дзяцей на мікрааўтобусе дапаможа ўпраўленне адукацыі. Упраўленне сацыяльнай аховы гатова выдаць матэрыяльную дапамогу: больш за 9 мільёнаў рублёў — добры ўнёсак у набыццё іншага аўтамабіля. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама даручыў звярнуцца да спонсараў. З такой дапамогай канчаткова вырашыць праблему і набыць аўтамабіль паабяцаў старшыня Шклоўскага райвыканкама Аляксандр Бойка.

Таксама ён паведаміў прыемную навіну: ААТ «Александрыйскае» будзе забяспечваць сваёй прадукцыяй (мясам і яблыкамі) па зніжаных цэнах, без гандлёвай надбаўкі, усе дзіцячыя дамы сямейнага тыпу ў Шклоўскім раёне. Прычым гаспадарка будзе рабіць гэта па замове і з дастаўкай.

### У пошуках справядлівасці

Былая даярка адной з гаспадарак Магілёўскага раёна 18 гадоў адпрацавала ў сельскай гаспадарцы. Дзесяць гадоў таму ёй выдзелілі недабудаваны дом, з цягам часу яна прывяла жыллё ў парадак, гадавала там дзяцей. Аднак потым у жыцці адбыліся перамены: жанчына вывучылася на прадаўца, працуе ў краме раённага спажывецкага таварыства. Цяпер кіраўніцтва новай аб'яднанай гаспадаркі просіць вызваліць жыллё.

Жанчына папрасіла даць ёй магчымасць прыватызаваць дом, дзе яна пражыла шмат гадоў ды ўклала ў яго шмат сіл і сродкаў. На прыёме высветлілася, што спрэчнае жыллё знаходзіцца ў абласной камунальнай уласнасці, і гаспадарка не мае да яго дачынення. Таму, калі праверка сітуацыі не выявіць іншых праблем, старшыня аблвыканкама прызнаў маральнае права жанчыны жыць у сваім доме і валодаць ім на законных падставах.

Іншыя заяўнікі, маладыя муж і жонка, якія маюць траіх дзяцей, звярнуліся з просьбай дасканала разабрацца ў справе будаўніцтва і выдзялення новага жылля ў Магілёўскім раёне. Шматдзетная сям'я лічыць, што іх незаконна пазбавілі магчымасці атрымаць кватэру ў пабудаваным доме, якая вызвалілася. Справа гэтая заблытаная, з удзелам мноства асоб, таму разбірацца з ёй будзе спецыяльная камісія і абласная пракуратура. «Усё будзе ў адпаведнасці з законам», — запэўнілі маладую сям'ю.

### Сірата пры маці

Калі няма бацькоў і падтрымкі сваякоў, маладым людзям цяжка разбірацца з праблемамі. Таму за станаўленнем сірот, прынамсі за забеспячэннем іх жыллём і працай, сочыць дзяржава. Аднак здараюцца і нестандартныя сітуацыі.

Людміла ў дзяцінстве пераехала ў Беларусь з бацькам — з Казахстана. Яны пасяліліся ў Дрыбінскім раёне, аднак пазней мужчыну пазбавілі бацькоўскіх правоў. Дзяўчынка жыла і выхоўвалася ў прыёмнай сям'і, а потым на поўным дзяржаўным забеспячэнні вучылася ў каледжы. Між тым, афіцыйны статус сіраты Людміла так і не атрымала, бо ў яе была маці (хаця нават яе адрас так і не быў устаноўлены).

Цяпер дзяўчыне няма дзе жыць. Людміла часова ўладкавалася ў маці сяброўкі ў Чавускім раёне і штодня за 25 кіламетраў на аўтобусе ездзіць у Магілёў, дзе працуе швачкай на прыватным прадпрыемстве.

У адрозненне ад іншых маладых людзей, Людміла зусім не настойвае на жыцці ў вялікім горадзе і з удзячнасцю прыняла прапанову паехаць у Шклоўскі раён. Там, запэўніў Пётр Руднік, ёй абавязкова дапамогуць наладзіць нармальнае жыццё: паклапоцяцца аб працы і жыллі.

Яшчэ аднаму маладому чалавеку, які застаўся без апекі бацькоў, паабяцаў дапамагчы Быхаўскі райвыканкам. Карней вучыцца ў ваеннай акадэміі, але яму няма куды падзецца, калі ён прыязджае ў родны горад. Маладому чалавеку будуць прадастаўляць пакой у інтэрнаце на час канікулаў. Нягледзячы на тое, што маці Карнея пазбаўлена бацькоўскіх правоў, малады чалавек занепакоены яе лёсам. Ён расказаў, што жанчына закадзіравалася і працуе ў сельскай гаспадарцы. Курсант папрасіў мясцовыя ўлады дапамагчы ёй з жыллём і вопраткай, іншымі рэчамі. Яму адказалі: калі ў маці сапраўды ёсць імкненне да цвярозага жыцця і нармальнай працы, то дапамога абавязкова будзе.

### Долевы рамонт

Пра капітальны рамонт клапоцяцца жыхары «хрушчоўкі» ў цэнтры Магілёва. Ад імя ўсіх да старшыні аблвыканкама звярнуўся пенсіянер Аляксандр Паўлавіч Кіслянкоў. Ён спытаў, чаму дом, якому больш за 50 гадоў, не ўключаны ў тытульны спіс на сёлетні капрамонт. Між тым, у некаторых месцах прамярзаюць сцены, а жыхарам дадзена прадпісанне балконамі не карыстацца.

Больш за ўсё Аляксандра Паўлавіча пакрыўдзіла, што ўлады не выканалі свайго абяцання. Ён прад'явіў паперу, дзе афіцыйна паведамляецца, што рамонт пачнуць якраз сёлета. Дзясятак падобных дамоў у гэтым раёне ўжо абноўлены.

Паводле слоў старшыні Магілёўскага гарвыканкама Станіслава Барадаўкі, летась у абласным цэнтры адрамантавана 40 тысяч квадратных метраў старога жылля, і гэта на 10 тысяч болей за год папярэдні. І хоць сродкаў не хапала і ў пэўны момант давялося ўсе сілы кінуць на рамонт дахаў, але ж горад робіць усё, што можа.

Што датычыцца канкрэтнага дома, то ў гэтым годзе будзе выраблена праектна-сметная дакументацыя на капрамонт, якая ўжо замоўлена. Пётр Руднік даручыў знайсці магчымасць пачаць работы ўжо сёлета, калі так было абяцана.

Разам з тым, кіраўнік вобласці выступіў з прапановай: вядома, што сродкаў на капітальны рамонт старога жылля ў дзяржавы небагата, таму частку выдаткаў маглі б узяць на сябе самі жыхары. Няхай гэтая частка будзе зусім невялікай, але і гэта паскорыла б работы. Улады такую ініцыятыву гатовы вітаць як добры прыклад агульнага ўдзелу ў вырашэнні актуальнай жыллёвай праблемы.

**Ілона ІВАНОВА**

■

■ У свеце

# ПЕРМАНЕНТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў ТУНІСЕ



Мінула ўжо больш за два гады з моманту, калі беспарадкі ў Тунісе справакавалі хваляванні па ўсім арабскім свеце, названыя пасля «арабскай вясной», а да стабільнасці ўсё яшчэ далёка. У тым ліку і ў самім Тунісе. Больш за тое, складваецца ўражанне, што ўсё толькі пагаршаецца. Пасля выгнання абвешчанага «дыктатарам» прэзідэнта Бен Алі рэзка знізіліся тэмпы росту эканомікі, скараціліся інвестыцыі (у цэлым за 2011 год прамыя замежныя інвестыцыі ў краіны Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі панізіліся на 24% да 50 млрд долараў, і тэндэнцыя прадоўжылася ў 2012 годзе). Як падлічыла падраздзяленне Reuters — BreakingViews, эканамічны ўрон ад «арабскай вясны», уключаючы бліжэйшыя гады, складзе для краін, якія ўзялі ў ёй удзел, прыкладна 225 мільярдаў долараў. І доля Туніса ў панесенай страце дастаткова вялікая, улічваючы, што па памеры насельніцтва ён удвая перавышае Лівію, а ўзровень заможнасці яго грамадзян (згодна з крытэрыем ВУП на душу) вышэйшы за ўкраінскі.

Усё гэта азначае скарачэнні паступленняў у бюджэт, рост беспрацоўя і нарастанне сацыяльнай напружанасці. Праблемы ў эканоміцы ўжо на Бен Алі не спішаш — цяпер за іх даводзіцца разлічвацца новай, «дэмакратычнай» уладзе. У Канстытуцыйнай асамблеі, дарэчы, дамінуе ісламісцкая «Партыя адраджэння», прадстаўнікі якой атрымалі 90 месцаў з 217. У той жа час на аднапартыйны ўрад мандатаў у партыі не хапіла, і яго давялося фарміраваць кааліцыйным, што палітычнай стабільнасці і развіццю эканомікі таксама відавочна не садзейнічае.

> **Тое, што з-за палітычнай нестабільнасці і пастаянных спроб новых рэвалюцый інвестары і проста багатыя людзі ўцякаюць з краіны і скарачаецца колькасць працоўных месцаў, для людзей вельмі абстрактная ідэя.**

Самай вялікай праблемай улады з'яўляецца вялікая колькасць людзей, якія ўпэўнены, што, калі ўрад або прэзідэнт перасталі быць ім сімпатычнымі, трэба выходзіць на вуліцу і рэвалюцыйным чынам здымаць уладу. Так і адбылося з Бен Алі, ці не праўда? А тое, што з-за палітычнай нестабільнасці і пастаянных спроб новых рэвалюцый інвестары і проста багатыя людзі ўцякаюць з краіны і скарачаецца колькасць працоўных месцаў, для іх вельмі абстрактная ідэя.

Перманентная рэвалюцыйнасць Туніса (як, зрэшты, і іншых краін, дзе «перамагла дэмакратыя» ў 2011 годзе) знайшла адлюстраванне ў трагікамічнай форме і ў спісе «100 глабальных мысліцеляў» 2012 года, складзеным амерыканскім часопісам Foreign Policy. Прэзідэнт Туніса Мансеф Марзукі заняў у гэтым спісе другое месца з фармулёўкай «за падтрыманне жыццядзейнасці ідэі «арабскай рэвалюцыі», што ў святле падзей у Тунісе выглядае неяк двухсэнсоўна. Цікава адзначыць таксама, што Туніс ужо з канца 1990-х мае пагадненне аб асацыяцыі з Еўрапейскім саюзам, такога ж кшталту, як і тое, ратыфікацыі якога цяпер некаторыя чакаюць ва Украіне як гарантыі працвітання эканомікі і адыходу ад цяперашніх праблем. Як паказвае вопыт Туніса, значна важней палітычная стабільнасць.



Трывожныя падзеі ў Тунісе на пачатку лютага 2013 года звязаны з забойствам невядомымі лідара апазіцыйнай «Партыі аб'яднаных патрыётаў-дэмакратаў». Шакры Белаід быў смяротна паранены чатырма выстраламі 6 лютага на парозе ўласнага дома. Гібель палітыка некаторыя звязалі з яго антыўрадавай дзейнасцю, хоць кіруючая партыя рашуча адхрысцілася ад «агіднага» злачынства. Гэтай заяве можна верыць, улічваючы тое, што забойства наносіць асноўны ўрон не апазіцыі, у якой шмат лідараў, а кіруючай партыі. Як і чакалася, пахаванне апазіцыйнага палітыка перарасло ў масавыя сутыкненні з паліцыяй у сталіцы. Гэты прыклад перанялі і пратэстуючыя ў іншых буйных гарадах краіны. У некалькіх гарадах былі падпалены офісы кіруючай партыі. Сітуацыя не палепшылася і пасля дэманстрацыі ў падтрымку «Партыі адраджэння». Яе ўдзельнікаў не было так многа, як пратэстуючых.

Пратэсты і сутыкненні пераraслі ва ўрадавы крызіс. Прэм'ер-міністр Туніса Хамадзі Джэбалі прыгразіў падаць у адстаўку, калі некалькі міністраў не будуць зменены. На яго думку, неабходна стварыць урад не з палітычных дзеячаў, а з прафесіяналаў. Хоць сам прэм'ер-міністр у адстаўку пакуль не пайшоў, тры міністры ад партыі «Кангрэс за рэспубліку», якая ўдзельнічала ў фарміраванні ўрада, падалі ў нядзелю ў адстаўку ў знак пратэсту супраць таго, што спроба Джэбалі набраць ва ўрад прафесіяналаў не ўвянчалася поспехам.

Цяжка прадказаць далейшае развіццё падзей. Хочацца спадзявацца, што разумны сэнс у большасці жыхароў Туніса атрымае перавагу і краіне ўдасца адысці ад пастаянных спроб змены ўлады пры дапамозе рэвалюцый. У адваротным выпадку беспрацоўе і ўзровень жыцця, які паніжаецца, — яшчэ не самы горшы сцэнарый. Улічваючы растучы градус супрацьстаяння і ўсё больш радыкальныя лозунгі пратэстуючых, магчыма развіццё падзей па сірыйскім узоры, з баямі на вуліцах і тысячамі загінулых. А такога нікому не пажадаеш.

**Сяргей КІЗІМА,**
**загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук**

■

# «АПТЫМІЗМ НАЙЛЕПШ СПРЫЯЕ ВА ЎСІХ СПРАВАХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Пра Ленінку, вопыт і законапраекты

**У школе я была** вельмі актыўнай, газету рэдагавала, вершы складала. Пасля паступіла ў БДУ на філфак, які размяшчаўся раней насупраць сённяшняга будынка Савета Рэспублікі. У гэтым будынку тады была «Ленінка» (Ленінская бібліятэка. — **Аўт.**), куды я 5 гадоў хадзіла рыхтавацца да іспытаў. Тады і падумаць не магла, што буду працаваць тут *(усміхаецца)*.



**Большую частку свайго жыцця** праводжу на працы. Але не скарджуся. Кожны ўчастак работы, які я прайшла ў жыцці, быў па-свойму цікавы. Калі б не было інтарэсу, многае, думаю, не атрымалася б.

**Ніколі мэтанакіравана не будавала кар'еру.** Проста так выхавана, што калі нейкі ўчастак работы даверылі, то выкладваюся на поўную катушку, каб не было сорамна перад людзьмі. Вось і атрымлівалася: добра спраўлялася на адным участку — прапаноўвалі наступны.

**У працы мне дапамагаюць** такія якасці, як адказнасць і настойлівасць. Калі мэта пастаўлена (а іх трэба дакладна ставіць і ў асабістым жыцці, і на працы), то тады ўсе сілы скіроўваю на тое, каб яе дасягнуць.

**Пераходзіць на больш высокую пасаду** заўсёды хвалююча. Праўда, мая новая праца звязана з папярэдняй, таму назапашаны вопыт вельмі дапамагае. Мы стараемся як мага больш узаемадзейнічаць з дэпутатамі ўсіх узроўняў, прыслухоўвацца да іх меркавання падчас разгляду законапраектаў. З 2007 года пры Савеце Рэспублікі дзейнічае Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Гэтая дэмакратычная структура дае магчымасць старшыням сельскіх, раённых, абласных Саветаў дэпутатаў больш хутка даносіць праблемы сваіх выбаршчыкаў да рэспубліканскіх органаў улады. Так, дзякуючы ініцыятыве Савета па ўзаемадзеянні вырашаны многія практычныя пытанні. Дапусцім, тыя ж вуліцы аграгарадкоў, якія раней былі нічыйнымі, цяпер знаходзяцца на балансе ЖКГ, вуліцы сельскіх населеных пунктаў абслугоўваюцца дарожнымі арганізацыямі.

**Наша камісія** (Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. — **Аўт.**) разглядае праекты законаў, не толькі звязаныя з работай органаў мясцовага самакіравання, але і законапраекты, якія тычацца гандлю, прамысловасці, транспарту, сувязі і г.д. Каб яны як мага больш дасканала рыхтаваліся і ўлічвалі інтарэсы кожнага, пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі створаны навукова-кансультатыўны савет.

## Пра малую радзіму, клопат і душэўную патрэбу

**Большую частку жыцця** пражыла ў Барысаўскім раёне. Гэта мой родны раён. Таму, як ні круці, але нясеш адказнасць за тое месца, дзе нарадзіўся, дзе цябе выхавалі, дзе да цябе добра ставяцца. Калі прыйшоў час працаваць намеснікам старшыні Барысаўскага райвыканкама па сацыяльнай сферы, было такое адчуванне, быццам іспыт здаю. Старалася зрабіць як мага больш і лепш. У першы год, памятаю, за адно лета ў школах адрамантавалі адразу ажно 22 дахі. Затое цяпер, калі прыязджаю ў раён і бачу тыя школы, альтанкі, якія мы некалі ўстанавілі, будынкі, якія рэстаўрыравалі, душа радуецца.

**Вельмі перажываю,** калі нешта ў маім раёне не так, бо хочацца, каб там усё было ў парадку. Дарэчы, барысаўчане мяне двойчы вылучалі ў дэпутаты. Я і сёння дэпутат абласнога Савета па Лошніцкай выбарчай акрузе. Пастаянна езджу туды, праводжу прыёмы грамадзян, стараюся паспрыяць у вырашэнні праблем.

**Дэпутатам не кожны можа стаць.** Ён павінен мець аўтарытэт не толькі сярод сваіх блізкіх і суседзяў, але і ў коле ўладных структур, бо дэпутат — гэта своеасаблівы праваднік паміж уладай і людзьмі.

**У дэпутаты ідуць** не для таго, каб грошы зарабіць, — гэта душэўная патрэба. І, ведаеце, вялікая справа, калі твае выбаршчыкі не толькі тэлефануюць са зваротам ці скаргай, але і са святамі віншуюць.

**За час маёй працы** старшынёй Мінскага абласнога Савета дэпутатаў мы ўкаранілі шмат новага. Пачалі праводзіць раз у паўгоддзе рэгіянальныя нарады дэпутатаў, на якіх дэпутаты сельскіх Саветаў, раённых і абласнога разам з членамі Савета Рэспублікі, дэпутатамі Парламента могуць абмяркоўваць праблемы, якія хвалююць рэгіён. Гэтыя нарады аб'ядноўваюць дэпутатаў усіх узроўняў і, што вельмі важна, павышаюць статус дэпутата сельскага Савета.

**Прыдумалі планёркі пры старшынях сельскага Савета.** Раз на 2 тыдні ў сельсавеце збіраюцца кіраўнік сельгасгаспадаркі, дырэктар школы і іншыя кіраўнікі і абмяркоўваюць надзённыя пытанні. Дапусцім, трэба прывесці ў парадак вясковыя могілкі. Дапамога ў гэтым плане павінна быць і з боку арганізацый, і з боку лясгасаў, і школьнікі могуць дапамагчы. Вось ужо 3 гады на Міншчыне праходзіць акцыя па бясплатным забеспячэнні дровамі адзінокіх пенсіянераў, шматдзетных сем'яў. Толькі летась завезлі 23 тысячы кубічных метраў дроў. Усім мясцовым службам нарэзалі свой кавалак работы, моладзь падключылі, каб пакалоць тыя дровы. Некаторыя пытаюцца: «Што яны там робяць у сельскім Савеце?» Паверце, клопатаў у старшыні сельскага Савета вельмі шмат. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова пабыць там хоць адзін дзень.

**Наша задача як дэпутатаў** — выхоўваць адказнасць у нашых выбаршчыкаў за свой участак работы, свой дом, сваю сям'ю. Нельга быць утрыманцамі. Я не люблю, калі людзі прыйдуць на прыём, да ўсіх прэтэнзіі выкажуць, а самі не могуць нават траву абкасіць каля ўласнай хаты ці ганак адрамантаваць. Трэба, каб не толькі ўлада ішла насустрач людзям, але і каб людзі ішлі насустрач уладзе. Тады і праблем будзе менш.

## Пра дзедаў дом, патрыятызм і пазітыў

**Мой дзень пачынаецца,** як правіла, з кубка кавы, зарадкі і пракручвання ў галаве планаў на дзень. Самае галоўнае, каб у кожным дні было нешта пазітыўнае і ў працы, і ў сям'і.

**Галоўнае не колькі зрабіў, а як.** Наколькі шчыра кантактуеш з людзьмі, клапоцішся, жадаеш дапамагчы. Так і з блізкімі. У мяне шмат сваякоў. Любім сустракацца на радзіме, пастаяць каля дома, які пабудаваў сто гадоў таму мой дзед, узгадаць дзяцінства. У нас вельмі цёплыя адносіны.



**Я патрыётка.** Ніколі не ўзнікала жаданне жыць за мяжой. Паездзіць, паглядзець — гэта адно, але жыць хочацца тут. У Беларусі надзейна, спакойна, чыста, прыгожа. І клімат наш, і ежа больш звыклыя — скажу, як ёсць. Некалі ў маладосці аб'ехала практычна ўвесь Савецкі Саюз. І цяпер выязджаю разам з сям'ёй адпачыць на мора — у прыватнасці, мне ў Крыме вельмі падабаецца. У Турцыі былі адзін раз, недзе на сёмы дзень нам усім траім захацелася дадому.

*Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.10.2012 г.*

**Дополнительная информация по контактному телефону организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34 и на сайте gomeloblreklama.by**

■ Спорт-тайм

# У ПРАЛЁЦЕ

**Фіяска хакейнай зборнай, поспех гандбалістаў, няўдача Домрачавай і нядрэнная гульня футбольнай дружыны Георгія Кандрацьева. «Звязда» ўзгадвае асноўныя падзеі, якія адбыліся ў айчынным спорце на мінулым тыдні**

**1. Зборная Беларусі па хакеі не едзе на Алімпіяду ў Сочы.** Сорамна. Крыўдна. Крыху нечакана, але час назад ужо не вернеш. Каманда Андрэя Скабелкі саступіла ў Военсе яшчэ ў першай сустрэчы са зборнай Славеніі (2:4) і ўжо на другі дзень спаборніцтваў даведалася, што глядзець Гульні прыйдзецца праз тэлевізар. Вось і парадокс. Беларусы адправіліся на турнір у Данію, маючы, напэўна, самы моцны склад (добрая палова нашых хакеістаў выступае ў Кантынентальнай хакейнай лізе), разам з гаспадарамі лічыліся фаварытамі. Нават гульню паміж суайчыннікамі Гамлета і беларусамі, як найцікавейшы паядынак міні-першынства, прызначылі на апошні дзень. Аднак за ўсіх усё загадзя вырашылі сціплыя славенцы, якія па чарзе перайгралі нас, Данію і Украіну. Чаму сціплыя? Хлопцы Мацяжа Капітара гуляюць пераважна ў Францыі, Германіі, Швецыі, Аўстрыі... Іх хакеісты, напэўна, не зарабляюць дзясяткі тысяч долараў у месяц, аднак гэта не перашкодзіла ім перайграць каманду Беларусі. Вікторыі над Украінай (6:0) і Даніяй (3:2) сталі суцяшальнымі. Наша зборная паўтарыла свой вынік 2005 года, калі прапусціла на Алімпіяду ў Турын зборную Латвіі. Між іншым, латвійскія хакеісты ў наступным годзе Алімпіяду пабачаць...

**2. Футбольная зборнай Беларусі, якую трэніруе Георгій Кандрацьеў, правяла першы паядынак у новым годзе.** У Турцыі беларусы сустрэліся з венграмі. Згулялі ў таварыскай сустрэчы нядрэнна, саступалі, але здолелі зрабіць лік роўным — 1:1. Трапным ударам у складзе беларусаў адзначыўся Аляксандр Валадзько. «Я задаволены тым, як згулялі, — прызнаўся «Прессболу» Кандрацьеў. — Атрымалася захаваць патрэбны тэмп на працягу ўсяго матча. Праверылі хлопцаў на няпрофільных пазіцыях у форс-мажорнай сітуацыі, зрабілі вывады». Цікава, а што далей у падрыхтоўцы нашай футбольнай зборнай? Перуанскае інфармацыйнае агенцтва «Андзіна» паведаміла, што на 26 сакавіка ў іх суайчыннікаў запланаваны таварыскі матч з беларусамі. «Мы звярнуліся да агентаў, упаўнаважаных ФІФА арганізоўваць таварыскія матчы, — кажа «Звяздзе» Сяргей Сафар'ян, намеснік старшыні Асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола». — Гэта тычыцца і азіяцкага рэгіёна, і паўночнаамерыканскага. Справа ў тым, што еўрапейскія асацыяцыі 22 і 26 сакавіка будуць занятыя ў афіцыйных матчах. Толькі мы з-за таго, што ў нашай групе 5 каманд будзем вольныя ў гэтыя дні. Але знайсці для спарынгу ў гэтыя дні еўрапейцаў вельмі цяжка. Менавіта таму пачалі шукаць магчымасць згуляць са зборнымі з іншых рэгіёнаў. Падобная праца працягваецца. У тым ліку і ў дачыненні да каманды Перу».

**3. Неяк няўдачна стартавала на чэмпіянаце свету па біятлоне, які сёлета прымае Чэхія, Дар'я Домрачава.** Наша Даша пакуль так і не патрапіла на п'едэстал пераможцаў. У спрынце яна апынулася на 43-м радку, а ў гонцы пераследавання прыйшла толькі 25-ай. Наступны старт павінен адбыцца 13 лютага — гэта індывідуальная гонка. Спадзяёмся, што ў Дар'і яшчэ знойдуцца сілы, каб выправіць становішча. У агульным заліку Кубка свету Домрачава саступае нарвежцы Туры Бергер, якая ідзе на першым месцы, больш за 230 балаў.

**4. Выдатна ў розыгрышы гандбольнай Лігі чэмпіёнаў працягвае выступаць мінскае «Дынама».** Хлопцы Сяргея Бябешкі загадзя забяспечылі сабе месца ў 1/8 фіналу прадстаўнічага турніру. Беларусы перамаглі ў гасцях каманду «Заграб» (25:23), чэмпіёна Харватыі, і замацаваліся на другой пазіцыі ў групе «D», апярэджваюць каманды са Швейцарыі, Венгрыі, Харватыі, Германіі. На першым месцы — непаўторная «Барселона», адзін з лідараў еўрапейскага клубнага гандбола.

**5. Баскетбол.** Ну вось і дачакаліся! Мінскія «Цмокі» атрымалі першую перамогу ў Адзінай лізе ВТБ. На роднай «Мінск-Арэне» беларусы былі мацней за клайпедскі «Няптунас» — 93:71. Адметна, што гэтай вікторыяй хлопцы Андрэя Крываноса перарвалі крыўдную серыю ў 13 паражэнняў.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

Фота Надзеі БУЖАН.



# Каманда Прэзідэнта зноў у лідарах

**Пакуль наша нацыянальная хакейная зборная ў дацкім Военсе спрабавала здабыць пуцёўку на Алімпіяду ў Сочы, дома працягваюць набіраць ход рэспубліканскія спаборніцтвы па хакеі сярод аматарскіх каманд на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. У матчы пятага тура каманда Прэзідэнта Беларусі абыграла дружыну Гомельскай вобласці з лікам 11:6. Самым рэзультатыўным гульцом у пераможцаў стаў форвард Сяргей Шміткоўскі, які набраў 5 ачкоў.**

Дарэчы, вышэйзгаданую сустрэчу можна назваць прынцыповай, бо дагэтуль толькі гэтыя каманды перамагалі на турніры: чатыры разы першынствавала каманда Прэзідэнта і аднойчы чэмпіёнамі станавіліся гамяльчане.

Гэтай перамогай каманда Прэзідэнта Беларусі афарміла выхад у плэй-оф, куды трапляюць чатыры лепшыя каманды па выніках першага этапу. Датэрмінова ў гэтую стадыю прайшлі і мінчане, якія займаюць другі радок у турнірнай табліцы. Найлепшыя шанцы папоўніць кампанію пераможцаў мае каманда Брэсцкай вобласці. Брастаўчане ў матчы пятага тура абыгралі віцебскіх хакеістаў — 4:3. Зараз дружына займае трэцяе месца на турніры.

Трэба адзначыць, што геаграфія правядзення турнірных матчаў заўсёды пашыраецца. У папярэднія гады хакеісты выходзілі на пляцоўкі амаль дзвюх дзясяткаў лядовых арэн. Сёлета спартсмены, напрыклад, упершыню выйшлі на лёд у Горках.

Дарэчы, у спаборніцтвах удзельнічаюць не толькі аматары, але і былыя прафесіяналы, а таксама трэнеры і іншыя хакейныя спецыялісты. Так, на турнір заяўлены галоўны трэнер нацыянальнай каманды па хакеі Андрэй Скабелка, галоўны трэнер юніёрскай зборнай Беларусі Андрэй Кавалёў, вядомыя экс-хакеісты Сяргей Стась, Алег Антоненка, Вадзім Бекбулатаў, Ігар Стэфановіч і іншыя.

Заключны тур спаборніцтваў адбудзецца 10 сакавіка, па выніках якога чацвёрка лепшых з паўфінальных стадый працягне барацьбу за прызавыя месцы.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■




Фота БЕЛТА.

■ Прамая лінія

# ТРЭБА ДЭКЛАРАВАЦЬ І НЕПАГАШАНЫЯ ПАЗЫКІ АД ЗАМЕЖНІКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 8, 9 лютага.)*

**— Чула, што сёлета істотна павялічыліся стаўкі зямельнага падатку для грамадзян у Мінскім раёне. Чаму гэта адбылося і як моцна яны павялічыліся?**

**Вікторыя Палівода,** *г. Мінск.*

— Стаўкі зямельнага падатку для фізічных асоб не мяняліся. Гэтая стаўка застаецца на леташнім узроўні. Аднак тут трэба разумець, што памер зямельнага падатку залежыць ад кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Калі ў Мінскім раёне землеўпарадкавальная служба правяла кадастравую пераацэнку зямель, то можа змяніцца і памер зямельнага падатку. Сама стаўка зямельнага падатку застаецца фіксаванай.

Напрыклад, калі кадастравы кошт зямельнага ўчастка складае да 80 млн рублёў за гектар, то стаўка зямельнага падатку будзе 80 тысяч рублёў за гектар. Калі кадастравы кошт гектара зямлі 80 млн рублёў за гектар і больш, то стаўка зямельнага падатку будзе складаць 0,1 працэнта ад кадастравага кошту зямлі.

**— Здаю ўласную кватэру маладой сям'і. Ці магчыма мне заплаціць фіксаваны падатак за здачу жылля адразу за год уперад? Калі памер такога падатку павялічыцца на працягу года, то мне даплачваць трэба будзе ці не?**

**Алег Муха,** *г. Брэст.*

— Падатак за год аплачваецца ў тэрмін не пазней першага дня каляндарнага года, у якім будзе ажыццяўляцца здача жылля ў арэнду. Пры змяненні падатковых ставак на працягу падатковага перыяду, за які фіксаваныя сумы падаходнага падатку аплачаны, такія сумы пераразліку не падлягаюць.

*Пытанне, атрыманае па электроннай пошце:*

**— Здаю кватэру ў Мінску, а жыву ў Расіі. Раней падаткі за здачу кватэры плаціла за мяне сяброўка. Зараз з сяброўкай мы не кантактуем. Ці магчыма зрабіць так, каб гэтыя падаткі за мяне плацілі арандатары?**

**Аляксандра Каліна,** *г. Мінск.*

— Плаціць падатак за здачу кватэры павінен той, хто атрымлівае даход. Аднак спадарыня Каліна можа даручыць аплату гэтага падатку і сваім кватарантам. Але тут існуе такі нюанс. Уласнік жылля павінен перадаць грошы гэтым людзям для аплаты падатку. Падатак за здачу кватэры ўласнымі грашыма павінен плаціць не кватарант, а ўласнік жылля, які атрымлівае адпаведны даход. У Мінску фіксаваны падатак за здачу аднаго жылога памяшкання ў 2013 годзе памеры такога падатку зменены і вызначаны ў межах ад 95 да 135 тысяч рублёў у месяц за кожны пакой.

**— Працую ў школе настаўніцай замежнай мовы. Некалькі разоў на месяц я яшчэ асобна дапамагаю некалькім вучням паглыблена вывучаць замежную мову. Бяру з іх па мінімуме — каля 10 долараў за 2 гадзіны. За мінулы год за такое рэпетытарства атрымала не больш за 200 долараў. Ці трэба мне дэклараваць гэты даход?**

**Ірына,** *г. Мінск.*

— Калі вы рашылі займацца рэпетытарствам, то вам трэба было да пачатку гэтай дзейнасці наведаць падатковую інспекцыю і стаць там на ўлік. Пасля гэтага вы павінны плаціць не падаходны падатак, а адзіны падатак. Гэта невялікая фіксаваная сума, якая плаціцца кожны месяц. У гэтым выпадку падаваць дэкларацыю па выніках года не трэба. Аднак, калі вы не зарэгістраваны ў падатковай інспекцыі і нічога не плацілі, то вам неабходна падаць дэкларацыю ў падатковую інспекцыю па месцы жыхарства.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ**

■


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**объекта долевого строительства Общества с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест» «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями административного, торгового значения и помещениями общественного назначения в д. Боровляны Минского района. Корректировка»**

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест», зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 14 мая 2009 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191116618.

**Адрес:** 220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Лукьяновича, 10-505/2.

**Режим работы:** пн.-пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

Телефон/факс: (017) 280-55-49.

**Информация о проекте строительства:**

**Наименование объекта:** «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями административного, торгового значения и помещениями общественного назначения в д. Боровляны Минского района. Корректировка».

**Местонахождение объекта строительства:** Минский район, д. Боровляны, ул. Березовая роща.

**Генеральный подрядчик:**

ОДО «НОВОДОМ», свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации № 190591061, выданное решением Мингорисполкома от 23 декабря 2004 № 2642.

Стоимость 1 м² с 21 января 2013 г. составляет от 1000 долларов США.

Уплата цены договора производится дольщиком единовременно либо поэтапно.

Применяется гибкая система скидок.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м² считается действительной до момента опубликования новой декларации.

**Начало строительства –** ноябрь 2012 г.

**Окончание строительства –** IV квартал 2013 г.:

1-ый пусковой комплекс (строительство четырех жилых секций) – IV квартал 2013 г.,

2-ой пусковой комплекс (строительство трех жилых секций) – IV квартал 2013 г.

3-ий пусковой комплекс (строительство встроенных нежилых помещений) – IV квартал 2013 г.

**Архитектурно-планировочные решения:** здание 79-квартирного жилого дома 3-этажное, состоит из 7-ми секций, с подвалом и техническим чердаком, имеет дугообразную форму с протяженностью здания – 155,72 м. На первом этаже первой секции расположены встроенные помещения: магазин непродовольственных товаров, помещения товарищества собственников, офисные помещения. На крыше размещена крышная котельная. Общая площадь жилого здания – 6211,0 м², жилая площадь – 5063,8 м². Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии).

**Административные помещения:** торговые помещения площадью 70,0 м², офисные помещения площадью 99,0 м², помещение собственников площадью 49,0 м² расположены на 1-ом этаже первой секции жилого дома № 2. Для административных помещений предусмотрены отдельные входы.

Количество квартир в жилом доме № 1 – 47 квартир, из них однокомнатных – 24 квартиры, двухкомнатных – 15 квартир, трехкомнатных – 8 квартир.

Количество квартир в жилом доме № 2 – 32 квартиры, из них однокомнатных – 16 квартир, двухкомнатных – 10 квартир, трехкомнатных – 6 квартир.

Фундаменты дома – столбчатые из монолитного железобетона под отдельно стоящие колонны и монолитные ленточные под стены цоколя.

Железобетонные несущие стены приняты толщиной 200 мм.

Колонны – железобетонные монолитные, квадратного сечения с размерами 400х400 мм и прямоугольного сечения 300х800 мм.

Диски перекрытий – монолитные железобетонные.

Наружные самонесущие стены – из блоков ячеистого бетона толщиной 500 мм.

Кровля – плоская рулонная с организованным внутренним водостоком.

**Застройщиком получены:**

экспертное заключение Дочернего республиканского унитарного предприятия «Госстройэкспертиза по Минской области» от 24.10.2012 № 2983-70/12;

решение Минского районного исполнительного комитета от 29.10.2012 № 7171 «О разрешении на строительство»;

разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по Минской области на производство строительно-монтажных работ от 29.01.2013 № 1-111Ж-893/12;

свидетельства о государственной регистрации земельных участков от 22.01.2013 г. № 600/991-7463, от 22.01.2012 № 600/991-7462.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, за исключением технического этажа и подвала, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания. Данное имущество поступает в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода дома в эксплуатацию это товарищество создано. В случае если такое товарищество не создано, лицу, определяемому общим собранием Дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлтерской организации ООО «Твоя столица», г. Минск, ул. Шафарнянская, 11. Время работы: понедельник – пятница: 9.00-18.00, выходные: суббота, воскресенье, тел./факс: +375 (17) 286 37 27, моб.: +375 (29) 680 01 01, +375 (29) 771 01 01.**


ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

# СУМНЫ ЮБІЛЕЙ «ЗІМОВАГА ЧАРАЎНІЦТВА»

**Сёлета спаўняецца 70 гадоў з пачатку адной з буйнейшых аперацый гітлераўскіх карнікаў па знішчэнні мірнага насельніцтва «Зімовае чараўніцтва», якую фашысты ўчынілі на тэрыторыі цяперашняга Верхнядзвінскага раёна.**

**Летась «Звязда» надрукавала ўспаміны былых насельнікаў «вогненных» вёсак, якія цудам выжылі (2 лістапада 2012 г.). Сёння мы прапануем расказы пра перажытыя боль і гора іншых сведак страшных падзей. Іх запісаў верхнядзвінскі краязнаўца Антон Францавіч Бубала — адзін з нямногіх, хто цудам выжыў у тым пекле. Летась Антону Францавічу споўнілася семдзесят. Краязнаўца прымае актыўны ўдзел у міжнародным праекце «Павышэнне статусу ўцалелых жыхароў спаленых вёсак».**

**Іван Васільевіч ЧАРНАВОК** нарадзіўся 3 лютага 1939 года ў вёсцы Чарнавокі. Як растлумачыў краязнаўца, разыходжанне ў запісе афіцыйнага года нараджэння Івана Чарнавока, і ўзросце, які назвала яго маці, тлумачыцца тым, што пасля вайны ўзрост асоб, якія не мелі дакументаў (былі спалены), вызначаўся «па знешнім выглядзе». Які быў той «выгляд» у людзей, што перажылі столькі гора, няцяжка ўявіць. Іван Васільевіч не любіць успамінаць мінулае. Ніжэй прыведзены фрагменты ўспамінаў яго маці і цёткі, запісаныя яшчэ ў 1990-х гадах.

**Ефрасіння Фёдараўна ЧАРНАВОК, маці Івана:**

— Наша вёска Чарнавокі-лясная, адна з «партызанскіх» вёсак. Карныя экспедыцыі ішлі тут адна за адной, але мы кожны раз хаваліся ў лясах. Людзей палілі ў адрыне, там, дзе цяпер помнік. Згарэла да трохсот чалавек — амаль усе, каго вылавілі ў лесе, уцекачы з іншых вёсак. Іх палілі ноччу. Але сцены не паспелі дагарэць да канца, бо нечаканы лівень патушыў агонь. Назаўтра ўнутры, пасярод чорных сцен, можна было бачыць людзей, якія недагарэлі. Іх было столькі, што гарэлі стоячы. Лівень абмыў іх зверху, відаць былі адмытыя ад сажы і попелу чарапы...

Хаваліся мы ў глухім балоце ля возера Дземя. Са мной былі два сыны: Пеця, пяці гадоў, і Іван, на два гады старэйшы. Аднойчы толькі вылезлі на свет Божы, а тут немцы. Адзін з іх паказаў знакамі і нягучна скамандаваў: «Аб! Аб!». Мы і падаліся назад. Больш вылазіць не адважыліся. Сядзелі ў балоце паўтара месяца. Днём дождж ідзе, а ноччу мароз падціскае — ужо ішла вясна. Пеця хварэў на тыф, там і памёр, ляжаў побач з намі. А Іван раней перахварэў, але там адмарозіў ножку. Некаторыя дзівіліся, як мы ўвогуле выжылі. Але ж у мяне вада была — усё ж балота; а яшчэ трава першая вылазіла — чарнагалоўкай мы яе называем, і была ў мяне да яе жменя солі. Аднойчы паспрабавала з балота выпаўзці. Сіл не было, ледзь дапаўзла да сцежкі. Ішлі міма партызаны. Стала прасіць хоць кавалачак хлеба. А яны ў адказ: «У нас НЗ. Ідзі ў зямлянкі». Дапаўзла. А на наступны дзень і сыноў маіх прынеслі.

Цяпер жыву з сынам Іванам. Астатнія мае мужчыны загінулі: два браты і муж — на вайне, сынок — у балоце.

**Настасся Фёдараўна ПАПСУЕВІЧ (ЧАРНАВОК), цётка Івана:**

— Мы з мамай і брацікам трапілі ў палон і былі ў лагеры ў Таболках. Я вырашыла ўцякаць у свае лясы, знайсці сястру. Бегла не адна — з партызанамі ды кадравымі ваеннымі. Дагналі нас і маці з браточкам, якая ведала наш план у падрабязнасцях. Маму маю старэнькую ваенны падхапіў на плячо. Кіламетраў праз дваццаць, каля Сямёнава мы патрапілі на немцаў, быў бой, але мужчыны нас не пакінулі, вырваліся мы. Дабіраліся да партызанскага лагера доўга, знайшлі там сваю Фросю. А на наступны дзень зноў экспедыцыя наляцела. Зноў уцякалі...

Іван дапамагаў маці будаваць дом на родным папялішчы, хатка выйшла невялікая. Ён не здаўся перад выпрабаваннямі лёсу. Вывучыўся, стаў спецыялістам лясной гаспадаркі, абзавёўся сям'ёй. Гэты прыгожы, разумны і добры чалавек жыве і цяпер у хатцы над рэчкай Свольнай. У вёсцы толькі шэсць чалавек слухаюць ранішнюю песню сасновага бору. Іван Васільевіч рады пагутарыць з рэдкім госцем з «вялікага свету». Ведаючы, што гэтыя сустрэчы нядоўгія, ён пераводзіць размову з ваеннай тэмы на мірную сучасную. Вайна засталася ў мінулым, пра якое ён не хоча гаварыць.

**Некаторыя дзівіліся, як мы ўвогуле выжылі. Але ж у мяне вада была — усё ж балота; а яшчэ трава першая вылазіла — чарнагалоўкай мы яе называлі, і была ў мяне да яе жменя солі.**

**Зінаіда Уладзіміраўна КУПЦОВА (КУКАЎКА)** нарадзілася 25 кастрычніка 1925 г. у вёсцы Дзедзіна ў сям'і сялян.

— Бацька быў кавалём, майстрам на ўсе рукі. Дзетак таксама «намайстраваў» нямала: шэсць дачок і сына. У калгас запісаўся адразу, разумеючы непазбежнасць пераўтварэнняў у вёсцы. Калі даведаліся пра вайну, мужчыны адправіліся ў райцэнтр, у Асвею. Але ваенкамат ужо эвакуяваўся, таму многія мужчыны засталіся з сем'ямі. Дзедзіна знаходзілася далёка ад гарнізонаў, якія да таго ж ужо праз год былі разгромлены. Таму немцы ў вёсцы былі больш рэдкімі гасцямі, чым партызаны. Партызаны паспелі папярэдзіць людзей аб пачатку карнай экспедыцыі, ды і зарыва пажараў па ўсім гарызонце з захаду падыходзіла з кожным днём усё бліжэй. Надышоў дзень, калі з-за рэчкі Вужыцы пачалі даносіцца перадсмяротныя крыкі людзей, падобныя на страшны хор. Вёска была дружнай, і калі на зарэчным узгорку з'явіліся фігуры карнікаў, невялікі абоз уцекачоў ужо сыходзіў на ўсход. На перавале дарогі апошні раз азірнуліся і ўбачылі, што родная вёска ўжо гарыць.

Новым прыстанкам стаў лес. Будан быў збудаваны па ўзору юрты: агонь раскладвалі ў цэнтры, над ім у «даху» была адтуліна для дыму. Спалі на лапніку вакол вогнішча. На ім «прапякалі» адзежу ад вошай і варылі што-небудзь ядомае. Побач было журавінавае балота — крыніца вітамінаў. Зрэдку, пасля пільнай разведкі, бегалі ў спаленыя вёскі, адшукваючы ямы з бульбай. Калі даведаліся, што карнікі сышлі, вярнуліся «дадому». Сярод папялішчаў стаялі «шкілеты» печаў.

У зямлянках не давялося жыць доўга, бо надышла другая, самая страшная, хваля экспедыцыі. На гэты раз мы забраліся далёка, у суседні Расонскі раён. У лясной вёсцы Лямно прытулілі нас добрыя людзі. Але партызаны сказалі, што ўжо блізка фронт і праз яго лінію можна прабрацца. Бежанцы памкнуліся за партызанамі. Пры пераправе цераз раку Нішчу пад намі абрынуўся мост, з халоднай вады цудам удалося выхапіць дзетак, якія пасыпаліся з воза, — дапамаглі партызаны. Але на левы бераг ракі перапраўляцца ўжо не адважыліся — там грукатаў фронт, ды і дзеці замярзалі, хоць старэйшыя і ўхутвалі іх у сваю вопратку, самі застаючыся, у чым прыйдзецца. Стаяла халодная ноч першых дзён сакавіка.

Тыя ж добрыя людзі ў Лямне прытулілі і на гэты раз. Але усе моцна галадалі. Аднойчы дзяўчаткі адважыліся на вылазку ў Дубровы — у вялікай вёсцы фашысты спалілі 500 чалавек. Сярод папялішчаў чамусьці стаяла ацалелая хата. Стомленыя сутачным пераходам дзяўчынкі, не думаючы пра небяспеку, напалілі ў печы і заснулі, даверыўшы свой лёс Богу. Прачнуліся толькі наступным ранкам. Хаваючыся за шкілетамі печаў, перасядзелі да цямна. Калі вярнуліся да сваіх, тыя ўжо маліліся па іх як па забітых. Як сапраўдны скарб прынеслі яны пару жменяў солі.

...Зінаіда Уладзіміраўна да гэтага часу лічыць, што нехта нябачны ўвесь час аберагаў іх. Бо былі ж і налёты, навокал гінула шмат людзей, дымілі папялішчы, чуліся крыкі, стогны, выбухі гранат і аўтаматныя чэргі. Аднойчы карнікі наляцелі зусім раптоўна. Дзеці ўмомант рассыпаліся ва ўсе бакі, як курапатчын вывадак. А сама яна засталася стаяць, прыціснуўшы да сябе немаўля. Але цуд: двое са зброяй жэстам паказалі ёй: «Хавайся!» і шпаркім крокам пайшлі туды, дзе ўжо стралялі.

Той нябачны апякун не пакінуў іх і пазней. У Лямне фронт прайшоў міма, па вялікіх дарогах. Ідучы следам за фронтам, два дні прасядзелі ў сваім лесе, скаланаючыся ад яшчэ блізкіх залпаў «кацюшы». У былым Дзедзіне нічога з закапанага дабра не аказалася. На кіламетры вакол — таксама. Увесь Асвейскі раён ператварыўся ў пустыню. Кукаўкі з усім сваім змучаным, але ацалелым «вывадкам» апынуліся на папялішчы. У бацькі адкрылася язва кішэчніка. Але ён не апусціў рук, а пачаў дзейнічаць, ратуючы сям'ю. Але гэта ўжо іншая гісторыя паўстання з попелу.

Зінаіда Аляксандраўна выгадавала дзяцей, ёсць і праўнукі. Сама сябе дакарае, што па неасцярожнасці зламала шыйку сцягна. А вось вочы яшчэ зоркія, і рукі не дрыжаць — чым-нічым ды і дапамагла б маладым...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Кватэрнае пытанне

# У ВЁСЦЫ — ЯК У ГОРАДЗЕ?

## Ці ў горадзе — як у вёсцы?

**Сёлета ў майго бацькі — інваліда ў сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС — падыходзіць чарга на атрыманне сацыяльнага жылля. У выканкаме сказалі, што кватэра будзе, хутчэй за ўсё, з няпоўным добраўпарадкаваннем... Якім патрабаванням (згодна з законам) павінны адпавядаць такія жылыя памяшканні?**

**А. Мельнік,** *Мінскі раён.*

У арт. 1 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь паняццю «жылое памяшканне сацыяльнага карыстання» дадзена тэрміналагічнае вызначэнне. Паводле яго, гэта ёсць жылое памяшканне тыпавых спажывецкіх якасцяў дзяржаўнага жыллёвага фонду, якое выдзяляецца грамадзянам на ўмовах дагавора найму.

У сваю чаргу, да іх, вось такіх, адносяцца жылыя памяшканні, якія адпавядаюць вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням і добраўпарадкаваны ў прымяненні да ўмоў адпаведнага населенага пункта.

Такім чынам, жылое памяшканне, якое выдзяляецца ў гэтым выпадку, павінна мець афіцыйны статус жылога памяшкання сацыяльнага карыстання з заключэннем адпаведнага дагавора найму жылога памяшкання.

Жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду ўключаецца ў склад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання па рашэнні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. У склад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання ўключаюцца жылыя памяшканні тыпавых спажывецкіх якасцяў, пабудаваныя (рэканструяваныя), набытыя, жылыя памяшканні, якія вызваліліся.

Што датычыцца ўзроўню іх добраўпарадкавання, то неабходна мець на ўвазе, што ўзровень інжынернага ўладкавання існуючага жыллёвага фонду ў розных рэгіёнах і населеных пунктаў неаднолькавы.

Так, калі ў сярэднім па рэспубліцы на пачатак 2012 года ўзровень аснашчанасці кватэр (з удзелам сельскіх населеных пунктаў) складаў: водаправодам — 73,1%, каналізацыяй — 71,4%, цэнтральным ацяпленнем — 72,3%, гарачым водазабеспячэннем — 63,6%, ваннамі (душам) — 66,1%, газам — 87,8%, то ў Мінскай вобласці, напрыклад, ён складаў адпаведна: водаправодам — 67,2%, каналізацыяй — 63,6%, цэнтральным ацяпленнем — 67,1%, гарачым водазабеспячэннем — 52,5%, ваннамі (душам) — 57,7%, газам — 93,5%. Па-ранейшаму назіраюцца значныя адрозненні ва ўзроўні добраўпарадкавання гарадскога і сельскага жыллёвага фонду.

На практыцы добраўпарадкаваным у прымяненні да ўмоў гэтага населенага пункта лічыцца жылое памяшканне, аснашчанае камунальнымі зручнасцямі, якія ёсць у большасці (звыш 50%) жылых дамоў у гэтым населеным пункце.

**Віктар САВІЦКІ**

■

■ Старыя рэчы

# Зімовая «класіка»

**Шмат падстаў любіць зіму: канькі, цюбінг, санкі і, безумоўна, лыжы. Памятаеце, як настаўнік фізкультуры казаў: «Апранайце футры, сёння займаемся на вуліцы!» і вёў нас да «агароджы» з лыжаў? «Дошкі» той «агароджы» былі рознакаляровымі, мелі розную велічыню, некаторыя з іх былі нават паламанымі, але на ўсіх чытаўся аднолькавы надпіс — «Це-ля-ха-ны».**

## ГІСТОРЫЯ «ЦЕЛЯХАНАЎ»

У 1944 годзе, пасля вызвалення Беларусі, у невялікім мястэчку нашай краіны Целяханы пабудавалі лесазавод, мэтай якога быў выраб піламатэрыялаў, неабходных у пасляваенны час для аднаўлення народнай гаспадаркі. Праз некалькі гадоў на гэтым прадпрыемстве пачалі вырабляць лыжы. У першы год эксперыменту было выпушчана 500 пар спартыўна-бегавых лыжаў. Яны былі цяжкімі, таму што выраблялiся з цэльнай драўніны, і прымітыўнымі. Паступова якасць спартыўнага інвентару паляпшалася: на фабрыцы наладзілі выпуск спачатку двухслаёвых, а потым шматслаёвых лыжаў.

Беларусь «стала на лыжы»: зімовыя заняткі фізічнай культурай у школах пачалі праводзіць на вуліцы, дзе вучні наразалі кругі вакол школы, нават спартыўны нарматыў для школьнікаў з'явіўся — бег на лыжах. Амаль у кожнай беларускай сям'і дома былі лыжы, для дзяцей і для дарослых — «Целяханы» выраблялі на любы ўзрост. Мацаванне на дзіцячых лыжах уяўляла сабой скураны абадок, у які ўстаўлялася нага ў абутку, а каб пятка не з'язджала, да лыжаў прыклейвалі невялікія гафрыраваныя кавалачкі гумы. Для дарослых існавала паўцвёрдае мацаванне: дзве алюмініевыя скобы, якія прыкручваліся да лыжы, злучаныя брызентавым раменьчыкам. Пазней з'явілася мацаванне са спецыяльнымі скуранымі чаравікамі, яно было самым зручным, а галоўнае — абараняла зімовыя боты (тады яны купляліся адны на некалькі сезонаў) ад хуткага зносу.

Для лепшага слізгання «Целяханы» адзін раз на сезон прасмольвалі, а непасрэдна перад паездкай мазалі спецыяльнай лыжнай маззю. У савецкія часы гэта была «Вісці», форма і каляровая ўпакоўка якой нагадвалі шакаладны батончык.

На экраны выходзілі фільмы пра лыжны спорт, — «Вялікі трамплін», «Міг удачы», «Ход белай каралевы»... Маці Дзядзькі Фёдара ў навагоднюю ноч з горада прыехала ў Прастаквашына таксама на лыжах... Усё гэта ўплывала на папулярызацыю захаплення лыжамі ў краіне. «Целяханы» сталі вядомымі за межамі Беларусі, лыжная фабрыка вырабляла каля паловы мільёна пар за год. У горадзе людзі захоўвалі лыжы на балконах і лоджыях, у вёсцы — адводзілі ім месца ў сенцах або ў кладоўках. Паступова на змену айчынным драўляным «Целяханам» пачалі прыходзіць замежныя пластыкавыя лыжы. «Нашы» саступалі замежным у слізганні і трываласці. У канцы 1980-х беларускае прадпрыемства засвоіла тэхналогію вырабу драўляна-пластыкавых лыж. Гэта было ўсё тое ж дрэва, але абабітае звонку пластыкам.

З распадам СССР, а разам з ім і эканамічных сувязяў, выраб лыжаў быў зведзены да мінімуму, і «Целяханы» на нейкі час амаль зніклі з продажу ў крамах. Сёння, напрыклад, у спартыўных аддзелах крам пераважаюць лыжы айчыннага вырабу. Дарэчы, драўляныя лыжы зараз вырабляюць толькі ў краінах былога СССР, дзе яны і карыстаюцца попытам.



## «ЧАМУ НЕ ЕЗДЗІЦЬ ЧАСЦЕЙ?»

У маладосці ліфцёр Вячаслава Ермаловіч вельмі любіла «навастрыць лыжы» ў парк каля дома. Новенькія «Целяханы» яна з мужам купіла за 10 савецкіх рублёў яшчэ ў 1967 годзе:

— Так атрымлівалася, што мы заўсёды жылі каля лесу. І на Харкаўскай, і тут, на Захадзе. Зараз гэты лес называюць «Мядзведжына». Тады лесапаркавай зоны тут не было, але лыжня існавала. Вось мы і каталіся. А лыжы мы купілі, як толькі пажаніліся.

Па словах Вячаславы, катанне на лыжах, пераважна «Целяханах», было дастаткова папулярным заняткам сярод савецкай моладзі, сябры і сяброўкі жанчыны любілі ў свой выхадны выбрацца ў лес на лыжную прагулку:

— Адзенемся цёпла-цёпла, крыху праедзем — ужо горача. Курткі паздымаем, павесім на галіны дрэў, і далей кругі наразаем, — успамінае Вячаслава. — У мяне лыжныя чаравікі былі чэшскія — раскоша ў той час. Ногі ніколі не замярзалі.

У сям'і Вячаславы Ермаловіч не абышлося і без паломак лыж. Жанчына ўзгадвае, як у адзін з першых выездаў у лес яе муж зламаў адну лыжу. Рамантаваць спортінвентар мужчына не стаў, проста... вырашыў больш не катацца. Таму Вячаслава наведвала лыжню ў Мядзведжына з сяброўкамі:

— Мае лыжы да гэтага часу цэлыя. Не так даўно я яшчэ на іх каталася. Праўда, цяпер мне няма з кім: дзеці не хочуць, а кампанію знайсці ў маім узросце ўжо цяжка.

Успамінаў у Вячаславы шмат: як з самаробных трамплінаў з'язджала, як радавалася «лыжнаму» надвор'ю. Таму і стаяць яе любімыя «дровы» на балконе, чакаюць свайго часу.

— Катацца яшчэ буду, вось толькі завязу іх на нашу дачу. Здаралася, спачатку лянуешся ехаць, потым пераадольваеш сябе — і не можаш нарадавацца лыжнай прагулцы. Задаеш сабе пытанне: «Ну чаму не ездзіць часцей?».

**Любоў БЯЛЯЕВА.**
**Фота аўтара**

### Цікава ведаць!

**Дзе ў сталіцы можна пакатацца на бегавых лыжах (у большасці з гэтых месцаў ёсць пункты пракату спортінвентару):**
**— лыжаролерная траса на пр. Пераможцаў, 22, м-н «Вяснянка»;**
**— Лошыцкі парк;**
**— парк Чалюскінцаў;**
**— Севастопальскі парк;**
**— лясныя масівы ў м-не «Зялёны луг»;**
**— лесапаркавая зона «Мядзведжына», м-н «Захад»;**
**— парк 60-годдзя Кастрычніка;**
**— лыжаролерная траса на вул. Сталетава;**
**— гарналыжны цэнтр «Сонечная даліна», м-н «Курасоўшчына»;**
**— м-н «Дражня» з боку вул. Ілімскай.**

■ Рэальная нерэальнасць

# ФАНТАСТЫЧНЫ ЭЛЕМЕНТ

**Фантастыка. Гэтае слова нікога не пакідае абыякавым. Чалавек заўсёды нешта ды адчуе, падумаўшы ці пачуўшы пра фантастыку. Бо гэтае паняцце насамрэч — складнік жыцця кожнага. Яно хвалюе і абуджае думкі. Пра мінулае і будучыню.**

*Узгадай, паважаны чытач, сваё дзяцінства. Што першае ты вывучаў на ўроках літаратуры? Казкі, эпасы, паданні. А калі стаў падлеткам, што чытаў? Няўжо з абыякавасцю праходзіў міма кніг пра адважных касмічных вандроўнікаў? А мары свае ўзгадай: ці не ўяўляў ты сябе на месцы якога-небудзь астранаўта, які змагаецца з касмічнымі піратамі, ратуе ад зла планету, а магчыма, і цэлы сусвет. Пра нешта падобнае марылі, без сумнення, амаль усе. І цяпер, стаўшы дарослымі, час ад часу, мы таксама марым пра які-небудзь цуд, які зробіць наша жыццё цікавейшым. Ці не праўда?*

*Што ж такое фантастыка? Чаму яна так нам патрэбна?*

*Лепш за ўсё адказы на гэтыя пытанні шукаць разам з чалавекам, які непасрэдна звязаны з фантастыкай. Таму мы вядзём гаворку з пісьменнікам Аляксандрам Сілецкім (яго раман «Дзеці, якія гуляюць у хованкі на траве», выдадзены ў выдавецтве «Харвест», атрымаў прэмію імя І.А. Яфрэмава ў намінацыі «За выдатны літаратурна-мастацкі твор» у катэгорыі «Навуковая фантастыка» ў 2011 годзе).*



**Аляксандр Валянцінавіч Сілецкі**

Празаік, журналіст, рэдактар. Нарадзіўся ў 1947 годзе ў Маскве, скончыў сцэнарна-кіназнаўчы факультэт Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Маскве; працаваў у рэдакцыях часопісаў «Земля и Вселенная», «Наука и религия», рэдактарам у розных выдавецтвах. Друкавацца пачаў з 1963 года ў часопісе «Юный техник». Аднак пасля ранняга дэбюту надышло доўгае маўчанне — «дзіўныя» творы фантаста не прымаліся савецкімі выдавецтвамі.

Апавяданні Сілецкага — мудрагелістая сумесь лірычнай прозы ў духу Брэдберы, змрочнай фантасмагорыі (вартай параўнання з Кафкам), дзіцячай фантастыкі, міфалогіі. Лепшыя апавяданні склаліся ў зборнік «Тым часам дзесьці...»(1989). Вылучаюцца апавяданні: «Пыльны шлях, зорныя дажджы» (1981), «Трэці дзень вецер» (1981), «Кіберамахія» (1980), «Душны пакой» (1988), «Асліны бальзам» (1989), «Чырвоны, каб бачыць здалёк...»(1989), «Мішэнь» (1990).

Ёсць у Сілецкага творы буйной формы: раман «Гадавальнік для мух» (1990) — пра іншапланетную калонію, якую раздзірае барацьба за ўладу; аповесць «Годнае градаапісанне» (1991), якая напісана ў традыцыях Салтыкова-Шчадрына і складаецца з асобных анекдотаў пра жыхароў горада Яжопаля.

На міжнародных конкурсах на лепшае навукова-фантастычнае апавяданне ў 1962 годзе Аляксандр Сілецкі атрымаў заахвочвальную прэмію, а ў 1965-м — першую. У 2008 годзе стаў лаўрэатам конкурсу «Сузор'е Аю-Даг».

Шэраг апавяданняў Аляксандра Сілецкага перакладзены на замежныя мовы — еўрапейскія і азіяцкія (усяго — на адзінаццаць моў).

З сярэдзіны 90-х гадоў Аляксандр Валянцінавіч Сілецкі жыве ў Беларусі, у Мінску.

— Нельга падвяргаць сумненню той факт, што фантастыка існуе столькі, колькі існуе сам чалавек. Старажытнейшыя паданні пра стварэнне свету і ўсяго жывога — ці ж гэта не фантастыка? Яна самая. Вось я і раблю выснову, што фантастыка — гэта тып мыслення, сродак пазнання чалавекам рэчаіснасці. Калі чалавек не мог растлумачыць тую ці іншую з'яву, тады і прыдумляў сваё тлумачэнне, як правіла, цесна звязанае з цудам. Такая прырода ў чалавека: яго не цікавіць простае бытапісанне, голыя, нічым не аздобленыя, карціны жыцця — яму заўсёды патрэбна нейкае «пераламленне» рэчаіснасці праз думкі і пачуцці, свае ці чужыя. У кожнага ж свой погляд на рэальнасць, і погляд гэты... нерэальны. Аднак што ёсць рэальнасць? Вечнае філасофскае пытанне...

***— Дык калі так разважаць, кожны здатны пісаць фантастыку? Бяры свае фантазіі і перанось на паперу ці, як гэта зараз робіцца — у камп'ютар? І вось ты ўжо пісьменнік-фантаст!***

— Зразумела, гэта не так. Кожны здольны марыць, фантазіраваць, кожны здатны запісаць плынь сваіх думак, выкласці ў той самы інтэрнэт, на літаратурныя сайты, напрыклад, і нават знайсці паклоннікаў свайго сачынення, але не кожны можа напісаць такі твор, прачытаўшы які, людзі ўбачаць уражвальную ідэю, адкрыюць для сябе новы, незвычайны бок якой-небудзь з'явы.

Любы твор — фантастычны не выключэнне — павінен мяняць чалавека, пажадана — у лепшы бок. А як могуць змяніць чытача прыгоды дзеля прыгод? Раманы-«хадзілкі», зробленыя па «сюжэце» камп'ютарных гульняў, напрыклад? Так, там прысутнічаюць фантастычныя элементы — бластары, касмічныя караблі, пачвары. Але змяніце гэта ўсё на эльфаў ды гномаў, на дзіды ды мячы, — ідэя твора зменіцца? Не, таму што ідэі там ніколі і не было. Не закладваў аўтар яе туды. Ён проста апісваў, паўтаруся, «хадзілку» героя: там камусьці твар набіў, там ворагаў перастраляў, там дзяўчынай прыгожай авалодаў. А з якой нагоды гэта ўсё — адказу няма. Можа, аўтар у рэальнасці не здатны тое самае зрабіць — вось і пераносіць на паперу, на камп'ютар свае мары, уяўляе сябе гэткім магутным і абаяльным валацугам, і, вядома, знаходзіць такіх, як сам, чытачоў...

Так атрымліваецца не літаратура, а сурагат, жуйка для мазгоў, не самых лепшых, дарэчы. І нічога добрага такая літаратура гэтым самым мазгам, якім на самой справе дапамога патрэбна, не прынясе, ніякага прагрэсу ў развіцці — толькі пацешыць комплексы, зробіць іх больш глыбокімі, закрые чалавека ад рэальнасці, а рэальнасць ад чалавека. Хіба ж гэта добра?

***— Хто ж тады сапраўдны пісьменнік-фантаст? Як ім стаць? Як пісаць сапраўдную фантастыку?***

— Напэўна, для гэтага, па-першае, трэба мець добрую адукацыю і вельмі шырокі кругагляд, каб не памыляцца з элементарнай фізікай, хіміяй ці біялогіяй, напрыклад. Па-другое — неабходны ясны, цвярозы погляд на жыццё і свет. Бо трэба расказаць сваю гісторыю так, каб людзям было цікава і зразумела, каб той, хто паслухаў гэтую гісторыю, пачаў бы разважаць, аналізаваць пачутае, рабіць стваральныя для сябе і свайго акружэння высновы.

У добрым фантастычным творы герой дзейнічае актыўна, разумна і грунтоўна. У яго заўсёды ёсць нейкая мэта, да якой ён ідзе праз шматлікія перашкоды, аднак упэўнена і настойліва. Падзеі, як правіла, адбываюцца на іншых планетах ці ў іншых часах (будучым, напрыклад), і пісьменнік адкідвае ўсё лішняе (я маю на ўвазе так званую «бытавуху»), што можа «замыліць» галоўную лінію, і такім чынам чытач атрымлівае чыстыя палотны падзей, пачуццяў, адносін. Такія творы вучаць чытача бачыць галоўнае і не надаваць залішняй увагі дробязям.

**Жыццё на нашай планеце не гіне і развіваецца толькі таму, што ёсць у свеце разнастайнасць. Тое ж павінна быць і ў літаратуры, у мастацтве наогул.**

***— Ужо цяпер навукоўцы праз розныя доследы даказалі: чалавек лепш успрымае тую інфармацыю, якая данесена да яго праз скажоныя вобразы. Напрыклад, нерэалістычныя выявы жывёл больш «чапляюць за жывое», мацней адбіваюцца ў свядомасці, выклікаюць больш пачуццяў у гледача. Фантастыка, на мой погляд, робіць тое самае ў літаратуры.***

— У нейкай меры пагаджуся. Таму мяне здзіўляе той факт, што многія цвёрда лічаць жанр фантастыкі несур'ёзным, а фантастычныя творы — творамі нізкага, масавага напрамку. Што ж, абвясціць тады дрэннымі кнігі, напрыклад, Брэдберы, Шэклі, Уэлса? Кнігі, якія да нашых дзён перачытваюцца мільёнамі людзей? Смешна чуць такое. Людзі ніколі не перастануць фантазіраваць і запісваць свае фантазіі...

***— Вы — майстар фантастычнага жанру. Калі ласка, дайце некалькі парад тым, хто толькі плануе брацца за пяро. Якіх традыцый, правілаў ім трымацца?***

— Я лічу, ніякіх традыцый ці правілаў у творчасці быць не павінна. Галоўнае для пісьменніка — яго асабісты стыль. Хіба трэба, каб было два Шэклі? Ці два Брэдберы? Жыццё на нашай планеце не гіне і развіваецца толькі таму, што ёсць у свеце разнастайнасць. Тое ж павінна быць і ў літаратуры, у мастацтве наогул. Калі фантастычныя творы будуць падобныя на нейкі эталон, усе яны будуць нікому не цікавыя.

Самая простая парада пісьменніку: пішаш — вядзі сам з сабою дыялог. Вось прыдумаў ты пачвару з двума хвастамі, якая здольная размаўляць на трох мовах і страляць з лазернай гарматы, — а навошта яна ў творы? Што ты гэтым хацеў сказаць? Патрэбна гэта пачвара чытачу? Якую ролю яна ў сюжэце адыграе? Ці яна — толькі спецэфект дзеля антуражу? Але ж спецэфектамі ўжо многія наеліся. Бо не яны «робяць» ідэю, не яны нясуць думкі ад творцы да чытача ці гледача... І перачытвай, перачытвай, спадар пісьменнік, тое, што напісаў. Глядзі на ўласныя сказы, на кожную сцэну, якую прыдумаў, вокам простага чытача: ці ўсё зразумела, ці цікава атрымалася, а можа, дзесьці штосьці лішняе напісаў, непатрэбнае, і яно толькі заблытае чалавека?

«Як проста!» — скажаце вы, аднак я запярэчу — не, няпроста. Але сапраўднаму пісьменніку трэба і нават неабходна глядзець на сябе і свае творы збоку. Як раілі героі казкі пра крывыя люстэркі...

**Гутарку вяла Іна СУДАРАВА**

■ На свае вочы

# Вандроўка па расійскай сталіцы

**«Горад, у якім жыве людзей больш, чым ва ўсёй Беларусі... Страшны, брудны, з нахабнымі і няветлівымі насельнікамі», — прыкладна такія стэрэатыпныя думкі бегалі па маім «шэрым рэчыве» на працягу ўсяго шляху ў расійскую сталіцу. Але Масква сустрэла мяне бадзёрай, трошкі туманнай раніцай на Беларускім вакзале. Дзіўна, але я не спужаўся гэтага горада. Не ведаючы, куды ісці і баючыся кагосьці пытацца (у галаве ўвесь час тахкала: «Цябе абавязкова падмануць!»), я вырашыў пайсці за асноўным натоўпам, што вельмі энергічна выплюхнуўся на перон з майго цягніка, — куды-небудзь ужо выведуць. І не памыліўся: усе ішлі да метро — яно мне і было патрэбна, каб дабрацца да гасцініцы. Я купіў картку на некалькі паездак і схему метрапалітэна (без яе ніяк!). Так і пачалася мая вандроўка — са знаёмства з «падземным маскоўскім павуціннем».**



«Чырвоныя вочы» Масквы.

## РУСКАГА Ў ГОРАДЗЕ ЯШЧЭ ПАШУКАЦЬ ТРЭБА!

Пасля таго, як я спусціўся на станцыю, мне спатрэбілася яшчэ хвілін 15-20 на тое, каб разабрацца ў тым самым павуцінні. Спачатку я шукаў сваю станцыю — «Беларускую». Вось яна. Потым патрэбную мне «Паляжаеўскую». Ёсць. А потым была цікавая гульня «лабірынт» — шукаў, як праехаць ад адной да другой. Адначасова з гэтым нервова сачыў за сваімі клункамі, каб ніхто не падфутболіў, не наступіў, бо людзей было — не перадаць колькі. Яны туды-сюды бегалі, ішлі, валачыліся, крочылі, прапіхваліся, ляцелі — адным словам, усё рухалася. Здавалася, што нават сама станцыя таксама. Але вось ужо маршрут пракладзены — і я спакойна (наколькі гэта дазваляла наваколная мітусня) паехаў.

Тут і спраўдзіўся адзін са стэрэатыпаў, пра які я зусім забыўся. Калі скажу, што вагон быў напоўнены больш чым на палову азіятамі, то дакладна не памылюся. Добра, калі кожны трэці пасажыр меў славянскае аблічча. Тады я падумаў: «Рускага ў Маскве яшчэ пашукаць трэба!». І яшчэ больш умацаваўся ў гэтай думцы, калі апынуўся ў гасцініцы. Амаль усе пакаёўкі і іншы некваліфікаваны персанал — гэта людзі з азіяцкай знешнасцю. Тое самае я ўбачыў пасля ў крамах, кавярнях і іншых месцах: прыбіральшчыцы, афіцыянты, прадавачкі — большасць азіяцкага паходжання.

## А ВОСЬ СЛАВУТАСЦІ САМІ ТРАПЛЯЮЦЦА

Для тых, хто любіць збіраць аўтографы «зорак», Масква — выдатнае месца для «палявання». Сапраўднае сафары атрымліваецца: вышукваць нікога не трэба — самі трапляюцца. Праз вялікі ўплыў расійскага тэлебачання і прэсы на беларусаў можна з упэўненасцю сказаць, што той, хто глядзіць тэлевізар, тут, у «белакаменнай», адчуваў бы сябе «сваім» і хадзіў бы паўсюль сярод знаёмых. Зойдзеш у кніжную краму — а там прэзентацыя кнігі Веніяміна Смехава (большасць ведае яго па ролі Атоса ў «Д'Артаньяне і трох мушкецёрах»). Калі ласка, падыходзь, знаёмся, размаўляй. Завітаеш у начны клуб (гэта са слоў знаёмых, бо сам клубы не люблю) — а там Мікалай Валуеў, былы баксёр, а цяпер дэпутат Дзяржаўнай Думы. Падыходзіць ці не — гэта ўжо самі вырашайце. І гэтак далей.

## КУБАЧАК КАВЫ ЗА 65 ДОЛАРАЎ

Вы яшчэ не галодныя? А я чаго-небудзь пажаваў бы. Вось і знакаміты ГУМ, што месціцца на Краснай плошчы. Тут, напэўна, будзе якая-небудзь кавярня.

Я зайшоў ва ўнівермаг і знайшоў доказы яшчэ аднаго стэрэатыпу: Масква — гэта самы дарагі горад. Бацькі расказвалі, што раней сюды, у маскоўскі ГУМ, ехалі па «дэфіцыт», бо тут можна было знайсці ўсё; таму былі тут заўсёды вялізныя чэргі. Сёння ў ГУМе, як і раней, можна знайсці ўсё, але чэргаў няма. Відаць, таму, што цэны сталі далёка не савецкія. Пра нятаннасць (мякка кажучы) сталіцы Расіі вельмі красамоўна скажа такі факт: у адной з ГУМскіх кавярань я знайшоў кубачак кавы па цане ў 2000 расійскіх рублёў (трошкі больш за 65 долараў). Гэта атрымліваецца, што на беларускія грошы — больш за 560 тысяч! Нішто сабе, ці не так? Вось вам і Масква. Таму ад «саўка» ў ГУМе застаўся толькі антураж, аздабленне, уніформа прадаўцоў.

Аднак добрае месца для выратавання майго згаладалага страўніка я ўсё ж такі знайшоў — сталоўка № 57. Яна проста так і называецца. Адзінае месца, дзе ва ўнівермагу засталіся вялікія чэргі. Бо там і паесці можна смачна, і каштаваць гэта будзе не так шмат. Самі паглядзіце: першае, другое, трэцяе і кампот, як той казаў, абыдзецца вам у суму прыкладна ад 200 да 400 рублёў (ад 60 да 120 тысяч беларускіх). Сёння, пагадзіцеся, нават для Мінска цэны смешныя.




Той самы ГУМ.

А гэта цэнтр Масквы. Цікава, што і замежнікі хутка разумеюць, дзе лепей харчавацца, і таксама гатовыя адстаяць чаргу, якая, між іншым, даволі хутка ідзе. Гэта толькі рускія могуць аддаць за кубачак кавы больш за паўсотні долараў...

## ЧЫРВОНЫЯ ВОЧЫ СТАЛІЦЫ

Чым яшчэ славіцца расійская сталіца? Правільна. Аўтамабільнымі заторамі. Яны тут і сапраўды даўжэзныя... Можна сказаць, што гэтыя заторы ўжо сталі часткай жыцця масквічоў. Калі едзеш раніцай на машыне, то па мясцовым радыё пастаянна чытаюць sms-кі слухачоў, якія пішуць нешта накшталт такога: «Я на Дзмітраўцы! Усе, хто тут са мною, трымайцеся! Мы вытрымаем!» Думаю, тых, хто пабач, гэта сапраўды падбадзёрвае. А таксама гэта разбівае той стэрэатып, што масквічы вельмі няветлівыя, не любяць адзін аднаго. Аказваецца — няпраўда. І там людзі добрыя ды спагадлівыя. Я чуў, што самі масквічы кажуць, быццам напышлівыя ў асноўным прыезджыя, якіх у Маскве, вядома, нямала. Можа быць, і так. У любым выпадку праз пэўны час я перастаў баяцца насельнікаў «белакаменнай», калі чагосьці не ведаў, запытваўся — адказвалі і дарогу паказвалі.

А яшчэ зраніцы, едучы ў машыне, здаецца, што ў Масквы чырвоныя вочы. І не таму, што яна па начах не спіць, а таму, што бачыш перад сабою толькі чырвоныя фары аўтамабіляў, якія цягнуцца наперадзе. Святло такое яркае, што немагчыма глядзець.

Але, відаць, кіроўцы ўжо прызвычаіліся, бо не едуць, а літаральна лавіруюць паміж машынамі, слізгаюць у свабодныя месцы. Тут ніякі ліхач не справіцца — трэба мякка, ледзь не пяшчотна кіраваць. Думаю, калі хто хоча навучыцца добра кіраваць машынай, то пару разоў павінен з'ездзіць у Маскву. Тады ўжо нічога страшна не будзе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,**
**фота аўтара.**

*г. Масква*

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
______________ С.А. Сушко
11.02.2013

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол заседания
Наблюдательного совета
ОАО «АСБ Беларусбанк»
29.01.2013 № 9

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## об открытой продаже облигаций
## Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»
## сто сорок пятого – сто сорок девятого выпусков

### Раздел 1
### ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

наименование эмитента на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес**

Место нахождения Банка: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18;

телефон: (017) 309 04 33; телефон/факс: (017) 222 26 26;

e-mail: info@belarusbank.by.

**3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, изъявившие желание приобрести облигации Банка 145-го, и/или 146-го, и/или 147-го, и/или 148-го, и/или 149-го выпусков (в дальнейшем именуемые совокупно «Облигации») на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940 в Банке, код 795 в соответствии с договором открытой продажи облигаций.

